

БАРОЦЦА... ЗА АЛІМПІЙСКІ МЕДАЛЬ 8

ФОТАПАЛЯВАННЕ НА ЗІМАРОДКА 13




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

19 ЖНІЎНЯ 2020 г. СЕРАДА № 160 (29274)


## ЦЫТАТА ДНЯ



**Віктар ЛІСКОВІЧ, старшыня Пастаяннай камісіі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу:**

*«Тыя звароты, што паступаюць сенатарам, разглядаюцца ў рамках заканадаўства. Наша мэта — аб'ектыўна разабрацца ў тых зваротах, якія да нас прыходзяць. Невыкананне законаў тоіць у сабе небяспечныя вынікі, непрымальныя для грамадства. Мы павінны ўсё вырашаць законна, аб'ектыўна. Прыкладаў, калі пытанні людзей вырашаюцца станоўча, вельмі шмат».*

# Кветкавы востраў



**У жыхаркі Слуцка Тамары НАЧЫНЫ агарод патанае ў кветках.**

**— Кветкавы востраў, — кажуць суседзі Тамары Віктараўне пра яе захапленне і клопат.**

**Усё лета на падворку пенсіянеркі буяюць ружы, лілеі, гладыёлусы, аксаміткі, цыніі, гваздзікі, званочкі, астры і, само сабою, флёксы.**

**Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.**

## КОРАТКА

- **Сусветная арганізацыя аховы здароўя заклікае да паўсюднай вакцынацыі супраць грыпу.**
- У Мінскай вобласці да сяўбы азімых збожжавых прыступяць 1 верасня.
- **Запазычанасць па зарплаце на «Сівельзе» ліквідаваная.**
- Амаль тысяча лясных пажараў здарылася ў Беларусі з пачатку года.
- **Электронны абмен мытнымі дакументамі з БЧ плануюць увесці па ўсёй Беларусі.**
- У Мінску запусцілі «гарачую лінію» па праблемных пытаннях горада. Пакінуць скаргу або заяву цяпер можна па нумары тэлефона — 375 17 215 95 95.
- **У Рагачоўскім раёне згарэў камбайн.**



Спадчына

# ЗЯМЛЯ КУПАЛЫ

## і іншых славутых

**Узда — гарадок камерны, утульны, з тых, дзе ўсе ўсіх ведаюць. Здаецца, гарадок як гарадок, у Беларусі такіх мноства, калі не ведаць, што гэты населены пункт і яго наваколлі — радзіма цэлай плеяды беларускіх класікаў: Кандрата Крапівы, Пятра Глебкі, Лідзіі Арабей, Алеся Якімовіча. А яшчэ менавіта тут бярэ выток род Янкі Купалы.**

У мястэчку — два «цэнтры»: сучасны і гістарычны. Размешчаны яны па абодва бакі шырокай вуліцы, па якой заязджаеш ва Узду з Мінска. Зварочваем у гістарычны цэнтр. Стары горад — драўляныя стрэхі тырчаць над платамі ў воблаку ўсыпаных яблыкамі і вішнямі галін фруктовых дрэў. То тут, то там з-пад утульнага вясковага аблічча «выглядвае» даўніна — гэтым старая Узда нагадвае Львоў у мініяцюры — але не сучасны, а такі, які ён быў гадоў 30 таму.



То тут, то там з-пад утульнага вясковага аблічча выглядвае даўніна.

СТАР. 9

З ветрыкам!

# НОВАЯ ДАРОГА Ў «СПАЛЬНЮ» ВІЦЕБСКА...

**Для сталіцы «Славянскага базару» завяршэнне трылогіі Году малой радзімы стала часам разгорнутага будаўніцтва і рэканструкцыі дарог. У хуткім часе прэзентуюць новую, пабудаваную «з нуля». Работы вяліся з 2014 года. Такім чынам, адным даўгабудам у Віцебску стане менш. Дарога — «вектар» у самы вядомы так званы спальны мікрараён Білева, дзе жыве больш за 40 тысяч чалавек.**

Калі проста растлумачыць тым, хто дрэнна ведае Віцебск або наогул тут ніколі не быў, новая «гарадская артэрыя» распачынаецца ад вядомага яшчэ з савецкіх часоў прадпрыемства «Віцязь», дзе і ў наш час сярод іншага выпрабляюць тэлевізійныя прыёмнікі. Дарога — працяг праспекта Будаўнікоў да «білеўскай вуліцы» Караткевіча. Даўжыня — каля аднаго кіламетра.

Аўтар гэтых радкоў у мінулую суботу прайшоўся па названым участку. Нягледзячы на выхадны, працуючых тут было шмат. Рабочыя займаліся добраўпарадкаваннем, падсыпалі, дзе трэба, асфальт. Калі працэс, наводзілі глянец у некаторых месцах трасы. Пакрыццё дарогі, сістэма асвятлення і рэгуліроўка дарожнага руху — усё ўжо зроблена, каб здаць дарогу ў эксплуатацыю.

У кожны бок вядуць па тры паласы, а асфальтабетоннае пакрыццё дазволіць пракаціцца з ветрыкам. Фактычна хуткасная магістраль не адрозніваецца ад найлепшых у краіне па арганізацыі дарожнага руху, мерах бяспекі, зручнасці для ўсіх яго ўдзельнікаў, у тым ліку і пешаходаў, веласіпедыстаў. Дарогу падзяляе «травяны прамавугольнік», схілы каля пешаходных дарожак упрыгожваюць кветкамі.

Калі рабіў здымкі, папрасіў падзяліцца ўражаннямі мінакоў. Так, тут ужо ходзяць пешаходы, людзі катаюцца на роварах, скейтах, роліках.

Адны з тых, з кім пагутарыў, шматдзетная сям'я з Білева. Выхоўваюць чацвярых маленькіх дзяцей: траіх дзяўчынак і самага меншага — сына Марка (пажартавалі, што ў гонар славутага віцебскага мастака Шагала).

СТАР. 10

ISSN 1990 - 763X

20160

З першых вуснаў

# «ПАДЗЕІ БУДУЦЬ РАЗВІВАЦЦА АДПАВЕДНЫМ ЧЫНАМ, АЛЕ МЫ РАЗУМЕЕМ, У ЯКІМ КІРУНКУ»

**Учора на нарадзе з членамі Савета бяспекі Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка даў адназначную ацэнку створанаму апазіцыяй каардынацыйнаму савету, назваўшы гэта спробай захопу ўлады з усімі вынікаючымі наступствамі.**


Фота БелТА.

Кіраўнік дзяржавы выказаўся аб сітуацыі, якая складваецца ўнутры краіны.

«Новы элемент — гэта спроба заспакоіць уладу і асабліва сілавыя структуры: «Мы мірныя, мы добрыя, разумееце, мы ўжо не хочам супрацьстаяння». Гэта так і не так. Гэта шырма. Калі зазірнуць за яе, вы бачыце, што адбываецца», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

Ён адзначыў, што ў краіне стварылі нейкі апазіцыйны штаб для перадачы ўлады.

«Яны нам падкідваюць іншы бок. І патрабуюць ні многа ні мала — перадаць ім уладу. Значыць, ***мы гэта расцэньваем адназначна: гэта спроба захопу ўлады*** з усімі вынікаючымі наступствамі», — падкрэсліў беларускі лідар.

«Таму я хачу папярэдзіць тых, хто ўвайшоў у гэты штаб, што мы будзем прымаць адэкватныя меры. Але выключна па Канстытуцыі і законе. У нас ***дастаткова гэтых мер, каб астудзіць некаторыя гарачыя галовы»,*** — папярэдзіў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы выказаўся і ў дачыненні да складу апазіцыйнага савета: «З былых «прыкарытнікаў», як яны іх называюць. Там былыя, пакрыўджаныя, якія калісьці праходзілі ва ўрадзе, і адкрыта адвязаныя нацысты. Паглядзіце гэты спіс».

## КРЫТЫКА ПА ПУНКТАХ

На нарадзе Аляксандр Лукашэнка раскрытыкаваў праграму апазіцыйнага штаба, у якой пералічаны першачарговыя меры да 2021 года і доўгатэрміновыя — да 2030 года.

Кіраўнік дзяржавы даручыў ва ўрадзе і Адміністрацыі Прэзідэнта на кожны пункт падрыхтаваць інфармацыю аб наступствах для краіны, калі гэта будзе рэалізавана. «Урад падрыхтуе ўсе матэрыялы, і мы потым народу далажым наступствы кожнага кроку», — сказаў ён.

Аляксандр Лукашэнка таксама асабіста выказаўся ў дачыненні да пунктаў праграмы.

«Напрыклад, выхад з Саюзнай дзяржавы, Еўразійскага саюза, Мытнага саюза (праўда, непісьменныя, такога ўжо няма — у нас Еўразійскі саюз ужо створаны ў развіццё Мытнага саюза), іншых інтэграцыйных утварэнняў, дзе дамінуе Расія. Павінен сказаць, што ні ў адной той структуры Расія не дамінуе. Трэба чытаць статутныя дакументы. Там ***пытанні прымаюцца кансэнсусам, і кожная краіна мае адзін голас»,*** — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Таксама апазіцыя прапануе ўвесці пагранічны і мытны кантроль на мяжы з Расіяй. «Гэта значыць, усталёўваецца беларуска-расійская мяжа з усімі вынікаючымі наступствамі», — адзначыў Прэзідэнт.

«Трэцяе — забарона продажу расійскім кампаніям аб'ектаў беларускай інфраструктуры. Расійскім! Паўстае пытанне: а якім можна? Натуральна, заходнім. Мая і наша пазіцыя адназначная: ***мы нікому нічога не збіраемся прадаваць.*** Так, як было да гэтага часу», — падкрэсліў беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка выказаўся таксама адносна пункта аб вызваленні СМІ ад кантролю з боку дзяржавы. «То-бок сёння кантроль дзяржавы — гэта дрэнна, не можа быць. А вось нейкі каардынацыйны савет з нейкіх шарлатанаў будзе створаны, вось яны будуць кантраляваць СМІ. Ну, так было ва Украіне і іншых краінах, вы гэта ведаеце», — сказаў Прэзідэнт.

Акрамя таго, апазіцыя прапануе забяспечыць трансляцыю ў Беларусі тэлеканалаў Латвіі, Літвы, Польшчы і Украіны.

«Яны будуць вяшчаць нам. І забарону трансляцыі ў Беларусі расійскіх тэлеканалаў. Без каментарыяў», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

У вайсковай сферы прапануюць выхад з АДКБ, закрыццё на тэрыторыі Беларусі расійскіх вайсковых баз — вузла сувязі ў Вілейцы і радыёлакацыйнай станцыі пад Баранавічамі. Пры гэтым на нарадзе было адзначана, што адпаведныя аб'екты нават не маюць статусу баз.

«Я не разумею, ***а чым пагражаюць нам вайсковыя базы?*** Гэта нават не базы, а падраздзяленні. Там — 90 працэнтаў — працуюць нашы людзі, атрымліваюць адпаведную заработную плату, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — Выхад з АДКБ... Трэба разумець, небяспека ў тым, што ў нас савецкая, расійская зброя. Калі мы выйдзем з АДКБ, ды пры такой антырасійскай лініі, у нас гэтая зброя ператворыцца ў хлам на працягу аднаго года».

«Гэта зброя, савецкарасійская, усё будзе знішчана. Па стандартах НАТА патрэбныя будуць велізарныя грошы для пераўзбраення арміі. ***Думаюць, што дадуць натаўцы. Ніхто нічога не дасць!*** Карачыцца будуць самі», — заўважыў кіраўнік дзяржавы.

«Далей: развіццё, прытым шырокае, пагранічнай інфраструктуры на захадзе з Еўрасаюзам. Пры гэтым, як вы чулі, закрываем мяжу з Расіяй. Наступствы няцяжка прадбачыць. Калі мы сёння гандлюем з Расіяй, што будзе заўтра, вы ведаеце», — звярнуў увагу Аляксандр Лукашэнка.

## МОЎНЫ АДКАЗ

Прэзідэнт выказаўся і наконт увядзення «паўзучай забароны» ў Беларусі рускай мовы.

«У адкрытую не кажуць, але паўзучая забарона рускай мовы. Уводзіцца пяняцце крымінальнай адказнасці за абразу беларускай мовы. Слухайце, а ў нас што, факты такія былі калісьці, што ***мы абражалі сваю родную мову? Ніколі гэтага не было»,*** — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Што да моўнай тэмы, то апазіцыя таксама прапануе перавесці на беларускую мову армію, а да 2030 года ўвесці адукацыю на беларускай мове ад дзіцячых садкоў да ўніверсітэтаў.

«Мы вызначыліся з вамі, мы прайшлі і перавярнулі гэтую старонку. Мы вызначыліся, як будзем дзейнічаць у плане беларускай і рускай моў. У нас яны дзяржаўныя, — адзначыў Прэзідэнт. — Мы дамовіліся, што не будзем педаліраваць гэтую тэму. ***Размаўляйце на любой мове.*** У нас і англійская не забаронена, ніякая. Ідзі кітайскую, англійскую вывучай. Не, трэба ўзняць гэтую праблему моўную!»

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што ў шэрагу краін, у тым ліку еўрапейскіх, ёсць па некалькі дзяржаўных моў.

«Аўстрыя наогул выкарыстоўвае нямецкую мову. І нічога, жывуць нармальна», — заўважыў ён.

Яшчэ адзін пункт апазіцыйнай праграмы — аднаўленне Беларускай аўтакефальнай праваслаўнай царквы ў супрацьвагу Беларускаму Экзархату Маскоўскага Патрыярхату.

«Мы заўсёды ганарыліся, што ў нас міжканфесійны мір, што ніхто нікому не перашкаджае. Ні праваслаўных, ні католікаў. Мусульмане ў нас задаволеныя жывуць, іудзеі і гэтак далей. ***Мы зараз акунёмся ў вайну, барацьбу міжканфесійную,*** і на гэтай глебе, і міжнацыянальнай. І атрымаецца, што тое, чым мы заўсёды ганарыліся, будзе адхілена і зганьбавана», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

## ТАМ, ДЗЕ НАС НЯМА

Нарэшце, гаворка ў апазіцыйнай праграме ідзе аб падачы заяў на членства ў Еўрасаюзе і НАТА. Наконт гэтага кіраўнік дзяржавы заўважыў, што ва Украіне «дэмакратыю ўсталявалі ўжо, напэўна, каля 10 гадоў таму», але ніхто іх ні ў НАТА, ні ў ЕС не прыняў. «Больш за тое, ніхто нікога там не чакае. Іх, а нас тым больш. Мы проста гэтым самым знішчым сваю краіну», — упэўнены беларускі лідар.

Ён звярнуў увагу, што нядаўна ў амерыканскіх СМІ з'явілася тэорыя аб саюзе трохмор'я: «Балтыка, Чорнае мора, Адрыятыка. Расіі там няма, Сербіі там няма, ***Беларусь ёсць. Нас ужо туды ўключылі».***

«Яшчэ раз падкрэсліваю: у найбліжэйшы час мы прааналізуем гэтыя пытанні і даложым народу аб наступствах падобных дзеянняў. Але вы сёння бачыце, наколькі скаардынавана тое, што яны спрабуюць нам падкінуць унутры краіны. Перавыбары, хаос і гэтак далей, забастоўкі на прадпрыемствах. Пачалі душыць сем'і дзяржслужачых, ваенных, міліцыі, СМІ. Мы ўсё гэта бачым», — рэзюмаваў Прэзідэнт.

## НА ЗАХОДНІХ РУБЯЖАХ

Кіраўнік Беларусі таксама пацвердзіў заклапочанасць сітуацыяй, якая складваецца ўздоўж заходніх межаў краіны. Для традыцыйнага абмеркавання сітуацыі, якая складваецца на сённяшні дзень у Беларусі, ён і сабраў нараду.

«Не толькі ўнутры нашай краіны, але і за яе межамі. Асабліва на нашых межах (сітуацыя. — «**Зв.**»). Вы памятаеце, у цэнтры стратэгічнага кіравання мы ўжо закраналі гэта пытанне, я пра гэта казаў. Некаторыя сярод нашых грамадзян расцанілі гэта як нагнятанне абстаноўкі. Маўляў, нічога падобнага на заходніх межах нашай краіны няма. Але думаю, што (учарашні вечар, асабліва ноч) вы пераканаліся ў тым, што ***тут не нагнятанне абстаноўкі, а была дакладная і правільная рэакцыя.*** Трэба было раней нам гэта ўлічваць і мець на ўвазе», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

«З'явіліся заявы прадстаўнікоў заходніх дзяржаў, у тым ліку і кіраўнікоў некаторых дзяржаў, якія наогул не ведаюць, дзе Беларусь знаходзіцца, і не ведаюць, што тут адбываецца. Але тым не менш робяць гэтыя заявы», — растлумачыў беларускі лідар.

«Прытым гэтыя заявы сведчаць аб тым, што, калі мы ў Мінабароны абмяркоўвалі гэтае пытанне, Прэзідэнт меў рацыю. І ***дзякуй богу, што мы адрэагавалі на гэта і разгарнулі баявыя падраздзяленні*** нашага войска на заходніх рубяжах нашай мяжы, прывялі іх у поўную баявую гатоўнасць. Міністр абароны мне далажыў, што ўсё гэта выканана, і адпаведныя часці сёння гатовыя да выканання сваіх абавязкаў, — сказаў Прэзідэнт. — Яшчэ раз падкрэслю: вельмі шкада, што асобныя падраздзяленні, асабліва сіл спецыяльных аперацый, нам давялося задзейнічаць для навядзення парадку ўнутры краіны. Ну, такая пэўная частка нашага насельніцтва. Яна не тое што не разумее, яна робіць гэта спецыяльна».

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што, як кажуць ваенныя, знешняя кампанента вымушае ўлічваць становішча і дзейнічаць адпаведным чынам.

«Гэта значыць, сёння не толькі ўнутры, але і звонку ў нас з'яўляюцца праблемы. І тое, што гэта абсалютна скаардынаваныя дзеянні, мы ўжо бачым у адкрытую. Але ***гэта яшчэ нават не пік.*** Падзеі будуць развівацца адпаведным чынам, але мы разумеем, у якім кірунку», — дадаў кіраўнік дзяржавы.

**Паводле БелТА.**

Афіцыйна

# З НАДЗЕЯЙ НА НАРМАЛІЗАЦЫЮ АБСТАНОЎКІ

## ЗНЕШНІ ЦІСК НА КІРАЎНІЦТВА БЕЛАРУСІ НЕДАПУШЧАЛЬНЫ

**У тэлефоннай размова Прэзідэнт Расіі Уладзімір Пуцін праінфармаваў Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнку аб перагаворах з канцлерам Германіі Ангелай Меркель і Прэзідэнтам Францыі Эмануэлем Макронам у частцы, якая датычыцца сітуацыі ў Беларусі.**

«Пры абмеркаванні сітуацыі ў Беларусі, якая абвастрылася, Уладзімір Пуцін падкрэсліў недапушчальнасць умяшання ва ўнутраныя справы рэспублікі і аказання ціску на беларускае кіраўніцтва. З абодвух бакоў выказана зацікаўленасць у больш хуткім урэгуляванні ўзніклых праблем», — адзначылі ў Крамлі накont размоваў з Эмануэлем Макронам.

Перад размовай з французскім калегам Уладзімір Пуцін меў тэлефонную размову з канцлерам ФРГ Ангелай Меркель.

«Грунтоўна разгледжана сітуацыя ў Беларусі, якая склалася пасля прэзідэнцкіх выбараў. З расійскага боку акцэнтавана непрымальнасць любых спроб умяшання звонку ва ўнутраныя справы рэспублікі, якія вядуць да далейшай эскалацыі крызісу. Выказана надзея на больш хуткую нармалізацыю абстаноўкі», — праінфармавалі ў Крамлі.

Акрамя таго, адбылася тэлефонная размова Уладзіміра Пуціна са старшынёй Еўрапейскага савета Шарлем Мішэлем.

«Напярэдадні саміту Еўрасаюза абмеркавана бягучае становішча спраў у Беларусі, — гаворыцца ў паведамленні крамлёўскай прэс-службы. — З расійскага боку выказана заклапочанасць у сувязі са спробамі шэрагу дзяржаў аказаць ціск на кіраўніцтва рэспублікі і ўсяляк дэстабілізаваць унутрыпалітычную абстаноўку. Выказана зацікаўленасць у тым, каб не дапусціць канфрантацыйнага варыянту развіцця падзей».

**Паводле БелТА.**

# АБ ПРАВАХ, АБАВЯЗКАХ І НАСТУПСТВАХ

## Усе прадпрыемствы рэальнага сектара эканомікі працуюць у штатным рэжыме

**Аб гэтым паведаміў журналістам прэм'ер-міністр Беларусі Раман ГАЛОЎЧАНКА пасля пасяджэння Прэзідыума Савета Міністраў.**


Фота БелТА.

Па словах кіраўніка ўрада, канвееры нідзе не спынены, рабочыя змены працягваюцца.

«Сапраўды, на некаторых прадпрыемствах ёсць невялікія групы пратэсна настроеных супрацоўнікаў, якія могуць быць незадаволеныя і такім чынам (бастуючы. — **«Зв.»**) выказваюць сваю пазіцыю ў дачыненні да таго, што адбываецца. Што асабліва сумна, спрабуюць уцягнуць большасць працоўнага калектыву, якая хоча працаваць і разумее, што праведзенне такіх незаконных акцый — згубны шлях», — канстатаваў прэм'ер-міністр.

Раман Галоўчанка растлумачыў, што артыкулам 41 Канстытуцыі прадугледжана права на забастоўку, а Працоўны кодэкс прадугледжвае дакладную працэдуру аб'яўлення забастоўкі, якая праводзіцца для вырашэння калектыўнай працоўнай спрэчкі, напрыклад, у выпадку парушэння правоў працоўных, працоўнага дагавора.

«Калі гэтая працэдура парушана, ні аб якой забастоўцы размова ісці не можа», — адзначыў Раман Галоўчанка, дадаўшы, што ўцягванне работнікаў у забастоўку ці іншыя пратэсныя акцыі з'яўляецца дзеяннем, якое караецца.

Акрамя таго, прэм'ер-міністр падкрэсліў, што перашкода рабоце прадпрыемства — гэта прамое прычыненне шкоды вытворчаму працэсу, праз якое прадпрыемства нясе страты. Да таго ж любы прастой, незалежна ад прычыны, аблягчае шлях на рынак канкурэнтам — а гэта занадта шчодры падарунак.

«Людзі хочуць працаваць і зарабляць. У зносінах з працоўнымі калектывамі выразна прасочваецца думка, што, так, нават калі нехта праявіў іншую грамадзянскую пазіцыю, зрабіў іншы выбар, гэта не мусіць змешвацца з работай эканомікі», — сказаў кіраўнік урада, нагадаўшы, што ў Беларусі — адкрытая эканоміка і працаваць трэба на поўных абаротах.

У прыклад прэм'ер прывёў хваляванні на «Беларуськаліі», дзе ў выніку на два дні знізіліся аб'ёмы вытворчасці. Адзін з асноўных канкурэнтаў беларускага прадпрыемства на абмежаваным сусветным рынку «Уралкалій» імгненна нарасціў аб'ёмы паставак. Падобная сітуацыя і па іншых таварных пазіцыях, звярнуў увагу Раман Галоўчанка.

Страты прадпрыемства ў выніку адбіваюцца на становішчы канкрэтнага працаўніка. Усведамленне гэтага дапамагае крыху знізіць градус і не паддавацца маніпуляцыям, упэўнены кіраўнік урада.

Як паведаміў Раман Галоўчанка, пакуль няма падстаў казаць, што нацыянальная эканоміка панесла нейкія страты, але па буйных прадпрыемствах падлічана шкода, якая можа наступіць у выпадку спынення работы. Працоўныя калектывы з інфармацыяй азнаёмленыя.

Пасяджэнне Прэзідыума — адно з шэрагу прысвечаных прыярытэтным кірункам развіцця краіны на наступны год. На ім разгледжаны выкананне прынятых рашэнняў па імпартазамяшчэнні і неабходныя меры па ўзмацненні яго эфектыўнасці. Сярод праблем, якія перашкаджаюць выраблюць адпаведны айчынны тавар, **першы намеснік прэм'ер-міністра Мікалай СНАПКОЎ** назваў састарэлыя тэхналогіі, недастатковa глыбока прапрацаваныя прапановы па эфектыўным тэхнічным пераўзбраенні вытворчасцяў, недастатковую матывацыю кіраўнікоў і персаналу прадпрыемстваў і незадзейнічанне патэнцыялу прыватнага бізнесу ў кааперацыйных ланцужках.

**Варвара МАРОЗАВА.**

Зварот

# «Мы рызыкуем сотнямі і тысячамі жыццяў!»

**Міністр аховы здароўя Уладзімір КАРАНІК выступіў з адкрытым пісьмом. Ён заклікаў медыкаў да дыялогу і адкрытага абмеркавання праблем, якія маюць месца.**



«Мне, як і большасці разважных калег, з болем і расчараваннем давялося глядзець на тое, што цяпер адбываецца ў сістэме аховы здароўя і ў медыцынскім асяроддзі. Мы замянілі нармальнае чалавечае кантактаванне ядавітымі пастамі ў сацыяльных сетках, прычым за спінай, спадцішка, без магчымасці выслухаць меркаванне другога боку. Канструктыўнае абмеркаванне замянілі абменам петыцыямі і прэс-рэлізамі. Я не прыхільнік мегафоннай дыпламатыі і заўсёды лічыў, што пошук рашэння за круглым сталом — заўсёды найбольш правільны шлях.

Але ўлічваючы, што людзьмі, якія ў сеціве пазіцыянавалі сябе як прадстаўнікі ўсяго медыцынскага асяроддзя, было прапанавана пайсці да Міністэрства аховы здароўя і задаць пытанні, а таксама прымаючы да ўвагі, што цяпер мы адчуваем страшэнны дэфіцыт кантактавання, я выйшаў да тых, хто сабраўся, каб выкарыстаць хоць бы гэту магчымасць наладзіць дыялог з калегамі. На жаль, як вы, напэўна, бачылі, дыялогу не было, склалася ўражанне, што ён і не патрэбны быў тым, хто сабраўся. І я нават не магу падабраць азначэнне таго, што адбывалася каля міністэрства, дзе, уласна, прадстаўнікі медыцынскай грамадскасці былі далёка не ў большасці».

Далей міністр разважае аб тым, што самым папулярным рытарычным пытаннем з'яўляецца «Чаму?».

«Я таксама часта задаю гэта пытанне: разглядаючы скаргі пацыентаў, размаўляючы з іх блізкімі і наведваючы розныя медыцынскія ўстановы. Чаму некаторыя нашы калегі мала размаўляюць з пацыентам, ігнаруючы відавочныя сімптомы, і таму памыляюцца з дыягназам, чаму дзяжурны персанал спіць, калі трэба ўначы дапамагчы хвораму, чаму ў ковідным стацыянары я знаходзіў пацыентаў з нізкім утрыманнем кіслароду без рэспіраторнай падтрымкі, чаму некаторыя нашы калегі бяруць, а часам і вымагаюць грошы з пацыентаў?

Але пры сутыкненні з падобнымі праблемамі, мне ніколі і ў галаву не прыходзіла пераводзіць абмеркаванне ў публічную прастору, у сетку Інтэрнэт і, выклікаючы агрэсію навакольных, абнародаваць прозвішчы нядбайных супрацоўнікаў для ўсеагульнага шальмавання. Я заўсёды лічыў правільным разабрацца ў прычынах, выправіць сітуацыю, канешне, пакараць вінаватых, а галоўнае — рабіць усе намаганні, каб гэтага не адбывалася ў будучым. Таму што нам не патрэбны піяр — нам патрэбны вынік, наша сістэма аховы здароўя павінна станавіцца лепшай, сучаснай і, што немалаважна, дабрэйшай».

Далей Уладзімір Каранік звяртае ўвагу на тое, што машыны хуткай дапамогі не выкарыстоўваліся супрацоўнікамі МУС для іх перавозкі да месцаў затрымання грамадзян, а падобную расфарбоўку маюць машыны медыцынскай дапамогі ўнутраных войскаў. Акрамя таго, 9 жніўня для аказання медыцынскай дапамогі затрыманым у кожным РУУС Мінска і буйных гарадах дзяжурыла хуткая дапамога. А ў месцах часовага ўтрымання працуюць медыкі не сістэмы аховы здароўя, а пенітэнцыярнай сістэмы.

Міністр нагадаў, што сістэма аховы здароўя не праводзіць судова-медыцынскую экспертызу і не мае права на яе накіроўваць (за выключэннем смерці ў стацыянары). Адзінае, што можна зрабіць, — зафіксаваць факт звароту па медыцынскую дапамогу, апісаць атрыманыя пашкоджанні і са слоў пацыента ўказаць абставіны іх атрымання. І гэта робіцца для ўсіх, хто звярнуўся, толькі за 16 жніўня ў Мінску іх было 160. Уладзімір Каранік падкрэсліў, што ў паталагаанатамічных бюро (моргах) сістэмы аховы здароўя няма неапазнаных трупаў, і туды дастаўляюць толькі памерлых у медыцынскіх установах. Загінулыя або памерлыя па-за медыцынскімі ўстановамі накіроўваюцца судова-медыцынскім экспертам, якія знаходзяцца па-за юрысдыкцыяй Міністэрства аховы здароўя.

«Але ёсць тое, што не ўкладваецца ў галаве, — заклікі абмежаваць работу амбулаторна-паліклінічнага звяна як па часе, так і па аб'ёме і складзе, а таксама спыніць аказанне планавай медыцынскай дапамогі ў стацыянарах. І гэта на фоне таго, што мы, як і іншыя краіны, абмяжавалі аказанне планавай медыцынскай дапамогі ў сувязі з COVID-19. У выніку ў нас назапасілася значная колькасць пацыентаў, якія чакаюць планавых аперацый і дыспансерных аглядаў.

Акрамя таго, улічваючы верагоднасць другой хвалі каранавіруснай інфекцыі, ссунуліся тэрміны прышчэпачнай кампаніі ад грыпу на сярэдзіну верасня, каб завяршыць яе да магчымага пад'ёму захваральнасці каранавіруснай інфекцыяй. У нас назапасіўся значны аб'ём работы, які трэба зрабіць менавіта цяпер, у гэты эпідэміялагічна светлы прамежак. Я ўпэўнены, нашы ўрачы разумеюць, што не выкананая своечасова планавая аперацыя — гэта не выяўленыя своечасова анкалагічныя хваробы, не дыягнаставаная дэкампенсацыя хранічнай паталогіі, больш высокая рызыка ўскладненняў, якія патрабуюць экстраннай медыцынскай дапамогі. Гэта значыць, мы рызыкуем сотнямі і тысячамі чалавечых жыццяў!..»

Уладзімір Каранік папрасіў утаймаваць эмоцыі і ўспомніць, што безумоўнае аказанне медыцынскай дапамогі — гэта пастулат, які не абмяркоўваецца і не ставіцца пад сумненне. А таксама заклікаў да дыялогу і адкрытага абмеркавання праблем, але не з ананімнымі персанажамі, а з людзьмі, схільнымі да дыялогу і ва ўмовах, якія прадугледжваюць кампраміс.

Другасныя рэсурсы

# РАЗГРУЗІЦЬ ПАЛІГОНЫ

## У Гродзенскай вобласці рэалізуецца некалькі значных праектаў па максімальным сартаванні другаснай сыравіны

**Самы буйны праект — будаўніцтва першай чаргі палігона цвёрдых бытавых адходаў пад Астраўцом. На 12 гектарах плошчы, акрамя карты для смецця, размесціцца лінія па сартаванні, драбілка для бетону і мінізавод па перапрацоўцы арганічнага смецця. Палігон разлічаны на 100 тысяч кубоў адходаў у год.**

### ТОЛЬКІ З ЛІНІЯЙ САРТАВАННЯ!

Для горада атамшчыкаў, які хутка развіваецца, такі аб'ект даволі актуальны. Паколькі праект маштабны, яго будаўніцтва будзе весціся ў тры этапы. Першую чаргу мяркуецца завяршыць напрыканцы года. Як расказала начальнік аддзела кантролю за абыходжаннем з адходамі Гродзенскага абласнога камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Валянціна ПУТРО, у Астраўцы з'явіцца цэлы комплекс, сапраўдны міні-завод па перапрацоўцы смецця, які будзе мець сваю свідравіну для пітной вады і ачышчальную сістэму. Галоўная асаблівасць аб'екта — лінія сартавання. Такі падыход цяпер абавязковы пры будаўніцтве новых палігонаў.

— Палігоны разгружаюцца, туды не паступаюць другасныя рэсурсы, яны вымаюцца падчас сартавання, — падкрэсліла суразмоўніца. — Зараз па вобласці са смецця вымаецца 25 працэнтаў другаснай сыравіны, але неабходна давесці лічбу да 30 і 35 працэнтаў. Праўда, гэта планы на наступнае дзесяцігоддзе.

Каб дасягнуць такіх вынікаў, у вобласці распрацавана адпаведная праграма па максімальным выманні другасных матэрыяльных рэсурсаў з камунальных адходаў і вяртанні іх у перапрацоўку. Зараз у раёне налічваецца дзевяць сартавальных станцый і Гродзенскі смеццесартавальны завод. Амаль усе яны, дзякуючы мадэрнізацыі, павялічылі свае магутнасці. Большасць аб'ектаў, у тым ліку і Астравецкі палігон, фінансуецца за кошт выдаткаў дзяржаўнай установы «Аператар другасных матэрыяльных рэсурсаў», дзе акумулююцца сродкі ад вытворцаў і пастаўшчыкоў.



Фота ostrovets.by

### СЛОНІМСКІ ВАРЫЯНТ

Станоўчы вопыт у згаданым кірунку назапашаны ў слонімскіх камунальнікаў. Тут стараюцца скарыстацца ўсімі магчымасцямі, каб атрымаць фінансаванне. Вядома, гэтаму папярэднічае значная «папяровая» работа, бо трэба скласці праект, зрабіць тэхніка-эканамічнае абгрунтаванне. Але і гэта яшчэ не ўсё. Для таго каб работа вялася сістэмна, трэба ўкараніць міні-праект, паказаць яго вынік, своечасова асвоіць сродкі. Інакш — вялікія штрафы і страта фінансавання. Таму гэту работу ў Слоніме стараюцца правільна спланаваць і расставіць прыярытэты. Па словах намесніка галоўнага інжынера Слонімскай ЖКГ Сяргея ПЯТЛІЦКАГА, менавіта за сродкі «Аператара другасных матэрыяльных рэсурсаў» і мясцовага бюджэту ў горадзе абсталявана лінія па сартаванні, набыта сем сучасных смеццявозаў, абноўлены кантэйнерны парк горада і прыватнага сектара.

Напрыклад, зараз тут працуюць над новым праектам, які дазволіць паменшыць нагрузку на сметнікі. Камунальным прадпрыемствам вядзецца распрацоўка праекта па тэхнічнай мадэрнізацыі палігона з кампасціраваннем арганічных адходаў.

— Сюды, у бурты, будуць складзіравацца тыя прадукты, якія застаюцца пасля сарціроўкі. Атрыманы з цягам часу кампост пойдзе на перасыпку палігонаў. Гэта значыць, што нам не прыйдзецца ў такіх аб'емах скарыстоўваць прыродныя рэсурсы — грунт і пясок. Пакуль што ў карце палігона менавіта прыродная арганіка, а не выбраная са смецця, і гэтую сітуацыю трэба змяняць, — упэўнены Сяргей Пятліцкі.

Вопыт слонімскіх камунальнікаў, якія супрацоўнічаюць з крыніцамі фінансавання, варта распаўсюджваць, лічаць у Гродзенскім абласным камітэце прыродных рэсурсаў. Сёння за сродкі «Аператара» ёсць магчымасць развіваць перапрацоўку другасных рэсурсаў і рэалізоўваць мерапрыемствы па абыходжанні з адходамі. Пакуль такую магчымасць скарыстоўваюць далёка не ўсе арганізацыі. У выніку не асвойваюцца нават тыя сродкі, якія выдзяляюцца пад канкрэтны праект.

### НЕ НА ЎЗРОЎНІ

Пакуль у Астраўцы будуецца новы палігон адходаў, мініпалігоны раёна забруджваюцца смеццем, якое адносіцца да другасных матэрыяльных рэсурсаў — гэта пэт-бутэлькі, поліэтылен, кардонныя скрынкі. Такія факты ўстаноўлены Камітэтам дзяржкантролю вобласці.

Інспектары звярнулі ўвагу і на работу лініі сартавання ў Лідскай ЖКГ, якая была ўведзена ў эксплуатацыю ў 2014 годзе за кошт сродкаў ДУ «Аператар другасных матэрыяльных рэсурсаў». Пазней камунальнае прадпрыемства лінію мадэрнізавала і давяло яе магутнасць да пяці тысяч тон у год. Але загрузіць яе работу на працягу двух гадоў удаецца толькі на 76 %. Летась не засвоены сродкі, выдзеленыя Лідскай ЖКГ зноў жа прадпрыемствам «Аператар другасных матэрыяльных рэсурсаў». Планавалася, што сума ў памеры 100 тысяч рублёў пойдзе на распрацоўку схемы абыходжання з камунальнымі адходамі шасці раёнаў вобласці. У будучым гэтыя раёны павінны ўвайсці ў адпаведны рэгіянальны комплекс у Лідскім раёне. Дарэчы, такіх цэнтраў у Гродзенскай вобласці плануецца стварыць чатыры. Кожны з іх будзе каардынаваць работу па абыходжанні з цвёрдымі камунальнымі адходамі па сваіх схемах.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Пандэмія рэзка скараціла эканамічны рост краін Паўднёва-Усходняй Азіі

Урады краін Паўднёва-Усходняй Азіі апублікавалі даныя аб ВУП за ІІІ квартал 2020 года. Эканамічны рост шэрагу дзяржаў рэгіёна рэзка скараціўся з-за каранавіруснай пандэміі, паведамляе японская тэлерадыёкампанія NHK.

Удакладняецца, што эканоміка Сінгапура з красавіка да чэрвеня скарацілася на 13,2 % у параўнанні з тым жа перыядам 2019 года. Гэта самае рэзкае скарачэнне з 1976 года, калі пачалося вядзенне падобнай статыстыкі.

Эканоміка Тайланда скарацілася на 12,2 %, што з'яўляецца самым вялікім скарачэннем з 1998 года, калі гэтая краіна пацярпела ад вынікаў Азіяцкага фінансавага крызісу. Эканоміка Малайзіі скарацілася на 17,1 %, а Філіпін — на 16,5 %.

Эканоміка Інданезіі скарацілася на 5,3 %. Гэта першае скарачэнне за 21 год.

Сур'ёзна пацярпеў турызм у Паўднёва-Усходняй Азіі з-за ўведзеных для барацьбы з пандэміяй абмежаванняў на ўезд. Асабістае спажыванне таксама рэзка знізілася на фоне скарачэння дзелавой актыўнасці і паездак.

Эксперты з вышэйпералічаных краін асцерагаюцца, што замежныя інвестары могуць вывесці свае грошы з гэтых эканомік, якія хутка развіваюцца, калі сітуацыя з каранавірусам будзе і далей пагаршацца.

## У Токіа з пачатку жніўня ад спёкі памерлі 79 чалавек



З пачатку жніўня ў Токіа ад уздзеяння спёкі памерлі па меншай меры 79 чалавек, паведамляе ТАСС са спасылкай на японскі тэлеканал NHK.

Па наяўнай інфармацыі, больш за 80 % усіх памерлых — людзі старэйшыя за 70 гадоў. Шмат хто з жыхароў японскай сталіцы загінуў у сваіх дамах і кватэрах, не абсталяваных кандыцыянерамі. У панядзелак, 17 жніўня, у Хамамацу тэмпература дасягнула 41,1 градуса, што з'яўляецца паўторам рэкорду, зафіксаванага два гады таму. У Токіа на гэтым тыдні тэмпература вышэй 33—35 градусаў.

У 2019 годзе ахвярамі спёкі ў Японіі сталі 126 чалавек.

## Колькасць хворых на каранавірус у свеце перавысіла 22 млн чалавек



Колькасць інфіцыраваных каранавірусам у свеце перавысіла 22 млн чалавек. Такія звесткі прыводзіць афіцыйны сайт універсітэта Джона Хопкінса (ЗША).

Па стане на 7.00 18 жніўня ў свеце інфіцыравана 22 050 487 чалавек, памерла 783 568, выздаравела 14 980 609.

Больш за ўсё захварэлых у ЗША — 5 403 213, з якіх памерла 172 052 чалавекі, у Бразіліі больш за 3,3 млн (памерла 107 852), у Індыі інфіцыравана каля 2,7 млн (50 921), у Расіі — 927 745 (15 740).

## Forbes апублікаваў рэйтынг самых высокааплатных спартсменак



Японская тэнісістка Наомі Осака ўзначаліла рэйтынг самых высокааплатных спартсменак за 2019 год, па версіі Forbes. Рэйтынг апублікаваны на сайце часопіса.

За год Осака зарабіла $37,4 млн — $3,4 млн спартсменка атрымала ў якасці прызавых, а астатнія $34 млн — па кантрактах са спонсарамі.

На $1,4 млн менш летась зарабіла амерыканская тэнісістка Серэна Уільямс.

Трэцяе месца заняла аўстралійка Эшлі Барці — $13,1 млн.

У 2019 годзе Осака займала другі радок у аналагічным рэйтынгу Forbes. Узначаліла спіс тады амерыканская тэнісістка Серэна Уільямс.

Осака займае дзясятае месца ў рэйтынгу Жаночай тэніснай асацыяцыі (WTA), у яе актыўе пяць тытулаў WTA. Яна з'яўляецца пераможцай Адкрытага чэмпіянату Аўстраліі 2019 года і Адкрытага чэмпіянату ЗША 2018 года.

## Новы тэмпературны рэкорд адзначаны ў Даліне Смерці



Новы тэмпературны рэкорд зафіксаваны ў Даліне Смерці — міжгорнай упадзіне ў раёне пустыні Махавэ (штат Каліфорнія) на захадзе ЗША. У мінулую нядзелю, 16 жніўня, тэмпература там дасягнула плюс 54,4 градуса.

Ранейшы тэмпературны рэкорд — усё ў той жа Даліне Смерці — быў, як мяркуецца, зафіксаваны ў 1913 годзе. Тады, паводле некаторых звестак, паветра ў гэтай частцы Каліфорніі прагрэлася да 56,5 градуса Цэльсія. Але «дакументальна» той рэкорд не быў пацверджаны, а некаторыя кліматолагі паставілі яго пад сумнеў, супаставіўшы тэмпературныя паказчыкі таго года ў іншых раёнах ЗША.

Не атрымаў пацвярджэння і рэкорд у 55 градусаў вышэй за нуль, нібыта зафіксаваны ў 1931 годзе ў Афрыцы, — гэтую інфармацыю палічылі не вартай даверу.

У выніку самай гарачай тэмпературай на планеце прынята лічыць паказчык у плюс 54 градусы, зарэгістраваны ў 2013 годзе ў Даліне Смерці.

На верагоднасць дасягнення новага рэкорду паказвае і тое, што незвычайна высокія тэмпературы фіксуюцца ў гэтыя дні ў многіх штатах — ад Арызоны да Вашынгтона.

## ПАЗНАЁМЦЕСЯ З БЯЛЫНІЧАМІ

**6 верасня, у першую нядзелю месяца, у краіне будзе адзначацца Дзень беларускага пісьменства. Да гэтай падзеі 20 жніўня Міністэрства сувязі і інфарматызацыі выпускае тэматычны канверт з арыгінальнай маркай, прысвечаны святу.**



Сёлета месцам яго дыслакацыі абраны Бялынічы — невялікі гарадок на паўночным захадзе Магілёўскай вобласці.

Канверт будзе зроблены на беларускай мове. Яго ўпрыгожаць выявы славутасцяў Бялыніч — царквы ў гонар Бялыніцкай іконы Божай Маці, раённага цэнтра культуры і раённага мастацкага музея імя слаўнага мастака Вітольда Бялыніцкага-Бірулі. Таксама на канверце будуць змешчаны герб горада і эмблема Дня беларускага пісьменства.

Канверт аддрукаваны тыражом 20 тысяч экзэмпляраў. Памятнае гашэнне пройдзе 6 верасня ў аддзяленні паштовай сувязі № 1 у Бялынічах.

## У ГОНАР ЗБІРАЛЬНІКАЎ МЁДУ

**Невялікая пчала хоць і з'яўляецца патэнцыйна небяспечнай для людзей (усё-такі алергічныя рэакцыі ад уджальванняў ніхто не адмяняў), але і карысць ад яе велізарная. У першую чаргу — для ўраджайнасці сельскагаспадарчых культур і пладовых дрэў. Даказана, што іх апыленне дазваляе павысіць збор пладоў больш чым напалову. Ды і не толькі ў гэтым карысць джаланосных істот — дзякуючы ім мы можам ласавацца мёдам, працуем з воскам, лечымся праполісам.**



Традыцыі бортніцтва існавалі на тэрыторыі нашай краіны здаўна. Вось таму і выпускаецца серыя «Пчалярства ў Беларусі». А на мінулым тыдні Міністэрства сувязі і інфарматызацыі выпусціла паштовую марку, прысвечаную меданоснай пчале.

Аркуш змяшчае сем марак і адзін купон. Марка аддрукавана накладам 56 тысяч экзэмпляраў. Намінал маркі «Р» адпавядае тарыфу на перасылку міжнароднай простай пісьмовай карэспандэнцыі (лістоў, бандэроляў, дробных пакетаў) масай да 20 грамаў уключна прыярытэтнай.

Акрамя таго, да гэтага выпуску была падрыхтаваная картка для картмаксімуму.

Праект падрыхтаваны ў супрацоўніцтве з федэрацыяй пчалярскіх арганізацый «Апіславія».

## КАРАНАВІРУС УНОСІЦЬ КАРЭКТЫВЫ

**Масавыя адмены авіярэйсаў, якія пачаліся яшчэ ўвесну праз пандэмію каранавіруса, не скончыліся і дагэтуль. Закранаюць яны і паштовую сферу. Нават пісьмовая карэспандэнцыя і наземныя пасылкі дагэтуль не прымаюцца ў некаторых дзяржавах. У асноўным гэта датычыцца краін, размешчаных па-за межамі еўрапейскага кантынента.**

А вось з дастаўкай адпраўленняў пры дапамозе паскоранай пошты EMS сітуацыя куды больш складаная. Напрыклад, іх пакуль не прымаюць Аўстралія, Мальта, Тайвань. У «стоп-лісце» таксама краіны Афрыкі, Акіяніі, Карыбскага басейна і Лацінскай Амерыкі. Агулам пакуль спіс такіх краін і тэрыторый налічвае больш за 60 пазіцый. Аператыўна азнаёміцца з ім можна на сайце «Белпошты» па спасылцы https://blog.belpost.by/Novosti/Priyemmezhdunarodnoypocht12.

Прадпрыемства нагадвае, што пакуль па ўсім свеце магчымыя затрымкі ў тэрмінах дастаўкі паскораных адпраўленняў, пасылак і лістоў.

# ТАВАР З ДАСТАЎКАЙ НА ДОМ

**З развіццём «сусветнай павуціны» пашыраюць сваю дзейнасць і інтэрнэт-крамы. Асабліва гэта важна для людзей, якія жывуць у невялікіх населеных пунктах. Цяпер ужо неабавязкова ехаць у вялікі горад, марнаваць на паход па крамах свой вольны час. Можна пасля работы ў сябе дома ў спакойнай абстаноўцы выбраць патрэбны тавар, параўнаць яго характарыстыкі і кошт з аналагічнымі. І, што немалаважна, выбраць найбольш аптымальны для сябе час дастаўкі або замовіць тавар праз пошту.**




Не адстае ад агульнай тэндэнцыі і «Белпошта». На яе базе стала працуе інтэрнэт-крама shop.belpost.by. Мы запыталіся пра асаблівасці яе работы ў прэс-цэнтры прадпрыемства.

— У нашай краме прадстаўлены шырокі спектр тавараў спажывецкага попыту. А таксама — паштовая і філатэлістычная прадукцыя. Агульная колькасць найменняў тавараў перавышае 15 тысяч, а вытворцаў больш за 300. У іх ліку — і найбуйнейшыя беларускія брэнды. Сярод тавараў, якія карыстаюцца найбольшым попытам, — інвентар для сельскагаспадарчых работ, адзенне, абутак, бытавая тэхніка і электратавары, посуд, пабытавая хімія, а таксама разнастайныя гаспадарчыя тавары. Прычым сітуацыя, якая склалася з распаўсюджваннем каранавіруса, паспрыяла таму, што колькасць заказаў у інтэрнэт-краме толькі павялічылася.

Адзін з інструментаў прасоўвання тавараў — спецыялізаваны друкаваны каталог «Тавары з Беларусі з дастаўкай». Яго экзэмпляры распаўсюджваюцца па ўсёй сетцы аб'ектаў паштовай сувязі РУП «Белпошта». Гэта больш за тры тысячы аддзяленняў па ўсёй Беларусі. Паштальёны атрымліваюць каталогі перад дастаўкай адпраўленняў на дом. Такім чынам, сотні тысяч нашых кліентаў своечасова даведваюцца пра ўсе навінкі і акцыі нашай інтэрнэт-крамы.

Так паштальёны дапамагаюць прасоўваць беларускую прадукцыю, разам з вытворцамі пашыраюць і абнаўляюць асартымент. Што да гарантыйнага абслугоўвання, то яно нічым не адрозніваецца па сваіх умовах ад таго, якое прапануецца ў звычайных гандлёвых пунктах.

Дзякуючы таму што «Белпошта» мае буйную сетку аб'ектаў сувязі, перасылка тавараў ажыццяўляецца ў любое месца Беларусі ў патрэбнае аддзяленне або паскоранай поштай EMS на дом. Працуе і пункт выдачы заказаў па адрасе: праспект Незалежнасці, 10, Мінск. У тым ліку магчымая дастаўка буйнагабарытных і цяжка вагавых тавараў (напрыклад, мэбля або буйная бытавая тэхніка) да пад'езда, каліткі або офіса. Трэба таксама адзначыць, што заказаныя ў нашай інтэрнэт-краме тавары дастаўляюцца ў 41 краіну свету.

Як жа аплаціць тавар?

— Мы прымаем аплату пластыкавымі карткамі, у тым ліку карткамі растэрміноўкі. Для «Халвы» яе тэрмін складае тры месяцы, для «Карткі пакупак» — чатыры, — растлумачылі ў прэс-службе. — Аплаціць тавар можна таксама праз сістэму АРІП. Калі тавар аплачваецца накладной платай — прымаюцца карткі і наяўныя ў любым пункце паштовай сувязі. Што да дастаўкі паскоранай поштай, то тут варыянтаў два — можна аплаціць тавар падчас замовы безнаяўным шляхам або разлічыцца непасрэдна з кур'ерам.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

## БЕСПЕРАБОЙНАЯ ДАСТАЎКА



**На Петрыкаўскім участку Калінкавіцкага раённага вузла паштовай сувязі Гомельскага філіяла РУП «Белпошта» інструктары-інспектары па эксплуатацыйных і арганізацыйных пытаннях Таццяна КАРНЕЙЧЫК (злева) і Ніна ЧЫРЫЧ (справа), выканаўца абавязкаў начальніка УПС Таццяна НОВІК (у цэнтры) абмяркоўваюць пытанні падпіскі.**



Паштальён Ніна ПЕРАРЭЖКА.

Фота Алены ДАЎЖАНОК.

# У чаканні першага званка

**На Гомельшчыне 1 верасня за парты сядуць 17 262 першакласнікі. Гэта на 650 дзяцей больш, чым летась.**

У бягучым навучальным годзе ўпершыню прагучыць званок у новай школе ў мікрараёне № 21 Гомеля. Установа адукацыі разлічана на 765 навучэнцаў. У будынку размесцяцца 33 класы трох паралеляў.

У самым вялікім сельскім населеным пункце Кармянскага раёна — аграгарадку Ліцвінавічы — звыш 130 дзяцей зноў вернуцца ў сваю школу. Яе будынак 1951 года пабудовы, які раней знаходзіўся ў аварыйным стане, перажыў маштабную рэканструкцыю і сёлета зноў адкрые свае дзверы для вучняў.

Між тым на Гомельшчыне зараз функцыянуе 1171 установа адукацыі. Прыёмку школ, ліцэяў і гімназій у Гомельскай вобласці плануецца завяршыць да 20 жніўня, адзначылі ў Галоўным упраўленні адукацыі Гомельскага аблвыканкама.

У рэгіёне на падрыхтоўку класаў, інжынерных сетак, харчаблокаў і прылеглай тэрыторыі прадугледжана амаль 22 мільёны рублёў бюджэтных сродкаў. Асноўная іх частка накіравана на рамонт установаў адукацыі. Таксама выдаткаваны грошы на набыццё камп'ютараў і лічбавага вучэбнага абсталявання.

На абнаўленне сталовых і буфетаў ва ўстановах адукацыі Гомельскай вобласці накіравана звыш 480 тысяч рублёў: гэта бюджэтныя, пазабюджэтныя сродкі і спонсарская дапамога. Значная частка гэтай сумы пайшла на закупку тэхналагічнага і халадзільнага абсталявання для харчаблокаў, дадалі ў Галоўным упраўленні адукацыі Гомельскага аблвыканкама.

Сёлета для падвозу дзяцей на заняткі будзе набыта 15 адзінак транспарту, у тым ліку дзве — спецыяльнага прызначэння з пад'ёмнікамі для дзяцей-інвалідаў. Зараз набыта 12 аўтобусаў, яшчэ па трох праводзяцца працэдуры закупкі. На гэтыя мэты з бюджэту Гомельскай вобласці выдзелена 1,46 мільёна рублёў, а таксама субвенцыі, што накіроўваюцца на пераадоленне наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС.

У сваю чаргу супрацоўнікі ДАІ УУС Гомельскага аблвыканкама перад пачаткам новага навучальнага года абследавалі вулічна-дарожную сетку каля ўстаноў адукацыі, каб удасканаліць дарожныя ўмовы на шляху дзяцей у школы.

Ва ўсіх установах адукацыі, што размешчаны ў зонах рэагавання падраздзяленняў аховы абласнога ўпраўлення Дэпартамента аховы МУС, устаноўлены ручныя сістэмы трывожнай сігналізацыі. Акрамя таго, паэтапна ўсталёўваюцца сістэмы відэаназірання.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**

Абітурыент–2020

# ПРАХАДНЫЯ БАЛЫ АКАЗАЛІСЯ НАШМАТ НІЖЭЙШЫЯ

## У БДУ і БДУІР падвялі вынікі залічэння на платную форму навучання

**Сярэдні конкурс па БДУ на дзённую платную форму склаў 1,2 чалавека на месца (у 2019 годзе — 1,4). На першы курс залічана 1856 абітурыентаў. Сярод іх — 1841 на поўны тэрмін навучання і 15 — на скарочаны.**

Сярод залічаных 189 скончылі з адзнакай сярэднюю школу або сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы, што складае 9,7 % ад агульнай колькасці залічаных (у 2019 годзе адпаведна 180 і 9,3 %). Выпускнікі ліцэяў і гімназій складаюць 45,6 % ад агульнай колькасці (у 2019 годзе 46,6 %). Абітурыенты, залічаныя па агульным конкурсе па выніках ЦТ, якія маюць больш за 300 балаў, складаюць 43 % (у 2019 годзе — 44,7 %).

Па хадайніцтве спартыўных федэрацый і саюзаў у адпаведнасці з п. 33 Правілаў прыёму на платную форму залічаны дадаткова 39 абітурыентаў.

Самыя высокія прахадныя балы на прыродазнаўчых спецыяльнасцях былі зафіксаваныя на «хіміі лекавых злучэнняў» — 315 (у 2019 годзе — 323), «інфарматыцы» — 313 (у 2019 годзе — 307), «камп'ютарнай матэматыцы і сістэмным аналізе» — 306 (у 2019 годзе — 283), «камп'ютарнай бяспецы» — 304 (у 2019 годзе — 274), «прыкладной інфарматыцы» — 301 (у 2019 годзе — 281) і «біяхіміі» — 296 (у 2019 годзе — 287).

Сярод сацыяльна-эканамічных і гуманітарных самыя высокія балы склаліся на наступных спецыяльнасцях: «міжнароднае права» — 333 (у 2019 годзе — 307), «міжнародныя адносіны» — 324 (у 2019 годзе — 325), «лінгвакраіназнаўства» — 312 (у 2019 годзе — 291), «сусветная эканоміка» — 300 (у 2019 годзе — 294), «правазнаўства» — 296 (у 2019 годзе — 310), «інфармацыя і камунікацыя» — 301 (у 2019 годзе — 305).

На завочную платную форму залічаны 680 абітурыентаў. Сярэдні конкурс склаў 1,3 чалавека на месца. Сярод залічаных 463 чалавекі паступілі на поўны тэрмін навучання і 217 — на скарочаны.

Па хадайніцтве спартыўных федэрацый і саюзаў у адпаведнасці з п. 33 Правілаў прыёму на платную форму залічаны дадаткова 4 абітурыенты.

Самыя высокія прахадныя балы склаліся на «правазнаўстве» — 257 (у 2019 годзе — 257), «матэматыцы і інфармацыйных тэхналогіях» — 269 (у 2019 годзе — 227).

На завочную платную форму для атрымання другой вышэйшай адукацыі (скарочаны тэрмін навучання) залічаны 132 абітурыенты.

На вячэрнюю форму навучання для атрымання другой вышэйшай адукацыі (скарочаны тэрмін) залічаны 30 абітурыентаў на спецыяльнасць «бізнес-адміністраванне». Прыём на гэтую форму вядзецца ў БДУ другі год запар.

У Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі на дзённую платную форму атрымання адукацыі залічылі 1248 студэнтаў (на тэхніка-тэхналагічным профілі будуць вучыцца 1025 чалавек і 223 — на эканамічным).

Максімальны прахадны бал — 310 — склаўся на спецыяльнасці «праграмнае забеспячэнне інфармацыйных тэхналогій» (факультэт камп'ютарных сістэм і сетак). На эканамічным профілі таксама парог высокі: 297 балаў на «электронным маркетынгу» (інжынерна-эканамічны факультэт) і 253 балы на «эканоміцы электроннага бізнесу» (інжынерна-эканамічны факультэт). Мінімальны бал (128) склаўся на спецыяльнасці «інфакамунікацыйныя сістэмы (стандартызацыя, сертыфікацыя і кантроль параметраў)» на факультэце інфакамунікацый.

На завочнай форме атрымання адукацыі за кошт уласных сродкаў будуць вучыцца 60 студэнтаў. На дыстанцыйную платную форму залічылі 150 чалавек.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Сацыяльны ракурс

# ДАШКОЛЬНІКАЎ БУДУЦЬ ВУЧЫЦЬ

## асновам эканамічнай культуры

**У новым навучальным годзе ў Беларусі будуць функцыянаваць 2952 установы дашкольнай адукацыі. Пра гэта падчас круглага стала ў прэс-цэнтры БелТА паведаміла намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення агульнай сярэдняй, дашкольнай і спецыяльнай адукацыі — начальнік упраўлення дашкольнай адукацыі Міністэрства адукацыі Альбіна ДАВІДОВІЧ.**

«Паводле аператыўнай інфармацыі, у 2020/2021 навучальным годзе будуць функцыянаваць 2952 установы дашкольнай адукацыі (у 2019-м — 2940). Плануецца, што дашкольныя ўстановы будуць наведваць 435,5 тысячы выхаванцаў (у 2019-м іх было 436,6 тысячы)», — праінфармавала Альбіна Давідовіч.

Паводле яе слоў, за першае паўгоддзе ў Беларусі ўведзена 12 новых устаноў дашкольнай адукацыі. Шмат робіцца для забеспячэння даступнасці дашкольнай адукацыі. «Пачынаючы з 2015 года ў краіне рэалізуецца адпаведны план мерапрыемстваў, зацверджаны ўрадам. За гэты перыяд пабудавана 73 установы дашкольнай адукацыі. Увогуле планам прадугледжана будаўніцтва 79 устаноў дашкольнай адукацыі. Гэта значыць, нам фактычна засталося пабудаваць шэсць, таму план мы дакладна павінны выканаць», — адзначыла намеснік начальніка ўпраўлення.

За кошт розных мерапрыемстваў плана — будаўніцтва ўстаноў дашкольнай адукацыі, адкрыцця груп кароткачасовага знаходжання і дзіцячых садкоў на першых паверхах у жылых будынках — дадаткова ўдалося стварыць каля 45 тысяч месцаў для дзяцей ранняга і дашкольнага ўзросту. Дзякуючы гэтаму за апошнія пяць гадоў паказчык ахопу ўстановамі дашкольнай адукацыі дзяцей ва ўзросце ад аднаго года да шасці гадоў павялічыўся на 10,1 % і складае 83,6 %. Ва ўзроставай катэгорыі ад трох да шасці гадоў прырост склаў 3,6 %, і на цяперашні момант ахоп дашкольнай адукацыяй гэтай катэгорыі складае 98,3 %.

Па словах Альбіны Давідовіч, выхаванцаў дзіцячых садкоў збіраюцца навучаць асновам эканамічнай культуры. Да пачатку навучальнага года выдадзены абноўлены вучэбна-метадычны комплекс «Мае першыя ўрокі» для ўстаноў дашкольнай адукацыі. Ён арыентаваны на ўзроставую групу дзяцей старэйшага дашкольнага ўзросту і ўключае ў сябе тры складнікі: вучэбна-метадычныя дапаможнікі для педагагічных работнікаў, навучальныя дапаможнікі для дзяцей старэйшага дашкольнага ўзросту і вучэбна-наглядныя дапаможнікі.

«Структура моцна не змянілася, але шэраг адукацыйных кампанентаў упершыню з'явіўся ў праграме. У прыватнасці, гэта адукацыйны кампанент, які звязаны з фарміраваннем эканамічнай культуры дзяцей дашкольнага ўзросту. Значныя змены зведала адукацыйная вобласць «Дзіця і грамадства» з улікам сучасных рэалій. Адукацыйная вобласць «Мастацтва» цяпер прадстаўлена музычным, выяўленчым мастацтвам, мастацкай літаратурай. Узмоцнены кампаненты, якія звязаны з індывідуалізацыяй адукацыйнага працэсу — гэта замежныя мовы (англійская, нямецкая, французская), дзіцячы фітнес, харэаграфія», — дадала намеснік начальніка ўпраўлення.

Альбіна Давідовіч нагадала, што ў 2019 годзе зацверджаны абноўленая вучэбная праграма дашкольнай адукацыі, новы адукацыйны стандарт і новы тыпавы вучэбны план. Як следства, адбылося абнаўленне вучэбна-метадычнага комплексу. Паралельна праводзіцца работа па павышэнні кваліфікацыі педагагічных работнікаў.

**Галоўны спецыяліст аддзела дашкольнай, агульнай сярэдняй і спецыяльнай адукацыі камітэта па адукацыі Мінгарвыканкама Алена МАКАРЭВІЧ** паведаміла, што ў сталіцы да канца года будуць уведзены чатыры дзіцячыя садкі:

«Мінск працуе над забеспячэннем даступнасці ўстаноў дашкольнай адукацыі. Сёлета плануецца ўвод у эксплуатацыю сямі ўстаноў дашкольнай адукацыі на 1 тысячу 600 месцаў. Тры з іх ужо ўведзеныя, дадаткова створана 650 месцаў для дзяцей ранняга і дашкольнага ўзросту. Да пачатку навучальнага года плануем увесці ў эксплуатацыю яшчэ адну дашкольную ўстанову і тры — да канца года ў залежнасці ад ступені іх гатоўнасці», — расказала Алена Макарэвіч.



Паводле яе слоў, на працягу пяці гадоў у Мінску павялічваецца колькасць выхаванцаў устаноў дашкольнай адукацыі. Калі ў 2016/2017 навучальным годзе дзіцячыя сады наведвалі 96 тысяч дзяцей, то ў мінулым — 101,8 тысячы. За апошнія пяць гадоў узрос і працэнт ахопу дзяцей дашкольнай адукацыяй ад аднаго да шасці гадоў. У мінулым навучальным годзе ён дасягаў 96,3 % — гэта самы высокі паказчык з усіх рэгіёнаў.

Паралельна ідзе развіццё груп з беларускай мовай навучання. «У мінулым навучальным годзе значна ўзрасла колькасць такіх груп. Калі ў 2018/2019 навучальным годзе іх было 144, то ў мінулым — 182. Гэтыя групы адкрываюцца па запыце бацькоў. На сённяшні момант мы задавальняем усе запыты», — запэўніла галоўны спецыяліст.

Добра развіта таксама сетка груп кароткачасовага знаходжання дзяцей. «Дашкольная адукацыя не з'яўляецца абавязковай, але многія бацькі жадаюць, каб іх дзіця наведвала дзіцячы калектыў. Таму мы таксама ідзём па развіцці гэтага кірунку. Летась у нас функцыянавала 439 такіх груп, якія наведвалі 5115 выхаванцаў, — дадала Алена Макарэвіч. — Значная работа праводзіцца па ўмацаванні і захаванні здароўя дзяцей, і яна дае свае вынікі. Пра гэта сведчаць лічбы — колькасць дзён, прапушчаных адным дзіцем па хваробе. У 2019 годзе ў Мінску гэты паказчык склаў 3,9 дня».

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Краіна здароўя

Вядучая рубрыкі Алена КРАВЕЦ.
Тэл. (017) 287-18-36.

# ХУТКА Ў ШКОЛУ?

## Што трэба ўмець першакласніку

**Штогод у шматлікую армію школьнікаў уліваецца новае папаўненне — першакласнікі. У класах іх чакае нязвыклая і цікавая, але вельмі нялёгкая работа. Яна звязана не толькі з фізічнымі намаганнямі (варта выседзець 35 хвілін урока), але і з вялікім нервовым напружаннем. Як вызначыць, ці гатовы шасцігодка першага верасня сесці за парту, і зрабіць так, каб з першых дзён дзіця не страціла інтарэс да школы, расказала ўрач-педыятр, загадчык 3-га педыятрычнага аддзялення 3-й гарадской дзіцячай клінічнай паліклінікі Мінска Людміла КІПЦЭВІЧ.**

— Большасць першакласнікаў паспяхова авалодвае школьнай праграмай, але для некаторых дзяцей радасць новага жыцця ў школе азмрочваецца няўдачамі. А гэта найперш няздольнасць выседзець урок і засяроджана займацца, — расказвае ўрач. — Вельмі хутка дзіця пачынае круціцца, абстрагавацца, не вельмі ўважліва слухаць настаўніка. У выніку не цалкам асэнсоўвае матэрыял, не спраўляецца з нагрузкай, часта адчувае расчараванне. Такім чынам дзеці паступова страчваюць цікавасць да школы.

Асабліва цяжкія бываюць першыя дні, а для часткі дзяцей — нават першыя месяцы ў школе. У гэты перыяд адбываецца складаны працэс адаптацыі. Для яе характэрныя пэўныя змены ў паводзінах, папярэджвае ўрач. У малых парушаецца сон, апетыт, з'яўляюцца раздражнёнасць, замкнёнасць, плаксівасць.

— Некаторыя першакласнікі часта хварэюць, а захворванні яшчэ больш аслабляюць арганізм. Таму дзіця абавязкова трэба рыхтаваць да навучання ў школе. І поспеху спрыяюць агульныя намаганні ўрача-педыятра, педагогаў і бацькоў, — падкрэслівае Людміла Кіпцэвіч.

Даныя медыцынскіх аглядаў з'яўляюцца асновай для вызначэння гатоўнасці дзіцяці да навучання ў школе. Такімі лічацца дзеці здаровыя, фізічна вынослівыя, з высокай супрацоўляльнасцю, якія хварэюць рэдка і непрацягла, лёгка пераносяць адаптацыю. А вось аслабленасць арганізма, частыя захворванні, хранічныя паталогіі — гэта фактары рызыкі пры паступленні ў школу.

Для асваення пісьма патрабуецца трэніроўка кісці. У многіх дзяцей у шэсць гадоў яшчэ не завершана развіццё мышачна-звязачнага апарату, адсутнічае ўстойлівы хватальны рэфлекс — яму лягчэй трымаць лыжку, аловак, аўтаручку ў кулаку. Неабходна навучыць малога правільна трымаць аловак трыма пальцамі, затым шляхам практыкаванняў дасягнуць дакладнасці, каардынаванасці рухаў.

Пры вызначэнні гатоўнасці да школы правяраецца і правільнасць маўлення. Дзіця павінна назваць карцінкі, падабраныя такім чынам, каб гук, які даследуецца, быў у пачатку, у сярэдзіне і ў канцы назвы. Напрыклад, набор карцінак для праверкі вымаўлення гука «р»: рыба, барабан, шар. Няправільнае вымаўленне хоць бы аднаго гука расцэньваецца як невыкананы этап.

### Важныя паказчыкі гарманічнага развіцця

Вельмі добра, калі да шасці гадоў дзіця навучыцца выконваць комплекс ранішняй гімнастыкі, катацца на двухколавым ровары, лыжах. Асабліва важна дакладна і строга прытрымлівацца распарадку дня: у адзін і той жа час класціся спаць і прачынацца, прымаць ежу, гуляць, займацца.

У шэсць гадоў вельмі часта выяўляюцца дэфекты пастаці. Адхіленні не толькі прыводзяць да парушэнняў апорнарухальнага апарату, але і неспрыяльна адбіваюцца на становішчы і на рабоце ўнутраных органаў (лёгкіх, сэрца, печані, страўнікава-кішачнага тракту). Таму ў дзіцяці трэба фарміраваць правільную позу пры сядзенні, хадзьбе, стаянні. Неабходна сістэматычна выкарыстоўваць спецыяльныя практыкаванні, якія ўмацоўваюць мышцы спіны, ступні. Практыкаванні лепш даваць у гульнявой форме. На штодзённых прагулках мэтазгодна выкарыстоўваць рухавыя гульні з бегам, скачкамі, лажаннем.

Падчас падрыхтоўкі да школы важна сфарміраваць у дзіцяці ўменні і навыкі ў прытрымліванні правілаў асабістай гігіены, неабходных для самаабслугоўвання ў школе. Тут няма дробязяў. Дзіця павінна ведаць, як увайсці ў клас, як сядзець за партай, як скласці падручнікі ў ранец, як акуратна апранацца, як карыстацца прыбіральняй, як паводзіць сябе ў школьнай сталоўцы, як кантактаваць з раўеснікамі.

— Чым больш развіццё, уменні і здароўе дзіцяці будуць адпавядаць эталонным патрабаванням, тым лягчэй дашкольніку будзе перайсці парог школы, тым большую цікавасць стане праяўляць дзіця да вучобы і менш стамляцца, — робіць выснову доктар.

Скажыце, доктар...

# РАССТРОЙСТВЫ АПЕТЫТУ, СНУ І ПАМЯЦІ

## Псіхолаг — пра тое, як супрацьстаяць узроставым змяненням псіхікі

**Прырода людзей такая, што яны няпроста пераносяць розныя жыццёвыя цяжкасці і непрыемнасці. Тое эмацыянальнае напружанне, якое пры гэтым узнікае, можа стаць прычынай нервовага зрыву. Асабліва востра гэта адбываецца ў людзей пажылога ўзросту. Як супрацьстаяць стрэсу і замарудзіць узроставыя змяненні псіхікі, расказала псіхолаг Гарадскога клінічнага псіхіятрычнага дыспансера Вольга ХВЯЖЭНКА.**



### Пераезд — моцны стрэс для пажылых

— Найбольш эфектыўным спосабам захавання душэўнай раўнавагі з'яўляецца актыўнасць. Чым шырэйшыя інтарэсы чалавека, чым большае кола яго абавязкаў; чым лепш ён адаптаваны, тым прасцей пераносіць непрыемнасці і няўдачы, — расказвае спецыяліст.

Кожны чалавек мае пэўны статус у грамадстве і сям'і і валодае для захавання гэтага статусу. Старэнне, хваробы і жыццёвая неўладкаванасць могуць выклікаць яго змяненне. Прычым для пажылых людзей важнае не столькі змяненне гэтага статусу, колькі звязанае з ім стаўленне навакольных. Людзі сталага веку цяжка прыстасоўваюцца да змянення жыццёвых умоў.

— Такая падзея, як пераезд, з'яўляецца для іх моцным стрэсам — доўгі час на новым месцы ўсё здаецца чужым, няўтульным, нязвыклым. Гэтак жа адбываецца, калі пераезд звязаны са змяненнем унутрысямейных адносін: неабходнасць з'язджацца з дарослымі дзецьмі ці раз'язджацца з імі прыводзіць да ўнутранай трывогі і разгубленасці, — тлумачыць псіхолаг. — Гэта можа прывесці да з'яўлення неўрозаў.

Пагаршэнне самаадчування і ўзроставыя змяненні таксама спрыяюць узнікненню неўрозаў. Агульнымі прыкметамі такога стану з'яўляюцца прыгнечанасць і маркота, беспрычынная трывога, зніжэнне настрою, расстройствы апетыту і сну. Мясцовымі праявамі неўрозаў у сталых людзей з'яўляюцца адчуванне закладзенасці ў грудзях, паколванне спераду пад ключыцай ці ззаду пад лапаткай, заміранне сэрца. Самыя нязначныя змяненні ў рабоце сэрца выклікаюць у некаторых пажылых людзей думкі аб сур'ёзных захворваннях сэрца і страх смерці. Акрамя таго, у сталым узросце сустракаюцца некаторыя псіханеўралагічныя хваробы, якія імітуюць тыя ці іншыя неўралагічныя паталогіі.

Вольга Хвяжэнка тлумачыць, што прычыны пералічаных адчуванняў самыя розныя.

— Часта нагодай з'яўляецца клімактэрычная перабудова арганізма. Гэтыя змены звычайна наступаюць у 47—50 гадоў і фізіялагічна праяўляюцца ў спыненні менструацый у жанчын і зніжэнні палавой функцыі ў мужчын. З'яўленню такіх расстройстваў садзейнічаюць розныя перажыванні: думкі пра набліжэнне старасці, пачуццё адзіноты, адсутнасць перспектыў, пачуццё непазбежнай смерці. Многія пажылыя людзі цяжка перажываюць знешнія прыкметы старэння, а таксама змяненні, звязаныя з палавой сферай, — любая дробязь можа трактавацца няправільна ці крайне тэндэнцыйна.

Псіхолаг заўважае, што жанчыны, як правіла, перажываюць перыяд клімаксу цяжэй за мужчын. Жанчынам уласцівая думка, што пасля клімаксу губляецца здольнасць да нармальнага палавога жыцця і надыходзіць поўнае фізічнае згасанне. Гэта не адпавядае рэчаіснасці, бо клімакс з'яўляецца ўсяго толькі чарговым этапам жыцця, да якога можна і трэба адаптавацца.

### Не спяшайцеся прымаць снатворнае

Яшчэ адной праблемай, на якую часта скардзяцца пажылыя людзі, з'яўляецца бяссонніца, а таксама ранняе прабуджэнне, перарывістыя ці неспакойны сон. Безумоўна, гэта выбівае з раўнавагі, псуе настрой на ўвесь дзень і нават пагаршае імунітэт. Урачы часта лечаць гэта снатворнымі сродкамі. Насамрэч патрэба ў снатворных значна меншая. Нярэдка здараецца, што прычынай згаданых сімптомаў з'яўляюцца праблемы стрававальнай сістэмы, расцяжэнне мачавога пухіра, прамой кішкі. Таму дастаткова звесці да мінімуму прыём ежы перад сном, і гэта дапаможа пазбегнуць адчування цяжару ў страўніку і падпірання дыяфрагмы.

— Лячэнне бяссонніцы з'яўляецца строга індывідуальным і залежыць ад канкрэтнага чалавека. Варта заўважыць, што снатворнае ў тэрапеўтычных дозах не гарантуе сну, а толькі садзейнічае яго ўзнікненню. Пасля прыёму лекаў чалавек, як правіла, засынае. Але толькі ў зручнай позе і пры адсутнасці знешніх раздражняльнікаў. Таксама добраму сну садзейнічаюць прагулкі на свежым паветры і праветрыванне памяшканняў, — кажа Вольга Хвяжэнка.

Яна звяртае ўвагу, што для працэсу старэння характэрным з'яўляецца аслабленне ўсіх функцый арганізма, парушэнне абмену рэчываў, пэўныя зрухі ў сасудзістай сістэме, у тым ліку ў сасудах галаўнога мозга, расстройства памяці. На шчасце, апошняму можна супрацьстаяць і рабіць некаторыя рэчы, якія дапамагаюць захаваць цвярозы розум. Найперш гэта станоўчыя эмоцыі, умераныя фізічныя нагрузкі, разумовая гімнастыка і прагулкі на свежым паветры. Шматгадовыя назіранні паказваюць, што адсутнасць інтэлектуальных стымулаў разбурае памяць мацней за ўзроставыя змяненні.

Найбольш частай праявай парушэнняў псіхікі ў познім узросце з'яўляюцца змяненні ў эмацыянальнай сферы — ад кароткіх перыядаў дрэннага настрою да моцных дэпрэсіўных расстройстваў. Пажылы чалавек пачынае крайне песімістычна ацэньваць сваё жыццё, адчувае сябе няварты быць сярод людзей, карыстацца жыццёвымі выгодамі.

### Пры якіх умовах варта звяртацца да псіхіятра?

Яшчэ адна частая непрыемнасць у людзей сталага веку — атрафічныя захворванні галаўнога мозга. Тыповым яго прадстаўніком з'яўляецца так званая сенільная слабасць розуму. Яна характарызуецца паступовым зніжэннем інтэлекту, сціраннем раней уласцівых гэтым людзям рыс характару, іх індывідуальнасці. У чалавека знікаюць усялякія інтарэсы, губляюцца ранейшыя схільнасці і сімпатыі, з'яўляюцца панурасць, сварлівасць, чэрствасць і злаславасць. Хворыя забываюць назвы вуліц, не могуць прызнаць блізкіх, цяперашнюю дату, час, свае імя і прозвішча, узрост. Паступова наступае поўная бездапамажнасць. Такія людзі маюць патрэбу ў пабочным доглядзе. З часам псіхічны распад узмацняецца. Лячэнне ў такіх выпадках не прыносіць ніякага прыкметнага выніку.

У познім пажылым узросце сустракаюцца і расстройствы ў стане трызнення. На іх узнікненне ўплываюць розныя фактары: страта сужэнца ці знікненне стабільнасці, уяўная недастатковая ўвага з боку блізкіх, адчуванне сваёй непатрэбнасці, пачуццё адзіноты, сам факт прызнання старэння. Гэта прыводзіць да ўзнікнення ўзаемнага неразумення паміж старым і тымі, хто побач з ім, што, у сваю чаргу, вядзе да непаразумення і канфліктаў. І тут мала хто разумее, што такія людзі маюць патрэбу ў кансультацыі кваліфікаванага псіхіятра.

— Пры любых змяненнях у псіхіцы пажылых людзей не трэба спяшацца ставіць кляймо «псіхічна хворы» старому чалавеку. Варта найперш паспрабаваць стварыць для яго камфортную маральную абстаноўку, — рэзюмуе спецыяліст.

Яўгенія АНДРЭЙЧЫКАВА:

# «МНЕ ПАДАБАЕЦЦА ТОЕ, ШТО Я РАБЛЮ. АСТАТНЯЕ НЕ МАЕ ЗНАЧЭННЯ»

## Спартсменка з Бабруйска разбурае стэрэатыпы аб вольнай барацьбе

**Вольная барацьба, дарэчы, як і ўсе адзінаборствы, асацыіруецца жорсткасцю, сутыкненнямі. А насамрэч гэта сапраўднае мастацтва са сваімі правіламі і законамі, якое не мае з бойкамі абсалютна нічога агульнага. Калі на пляцоўку выходзяць дзяўчаты, барцоўскі паядынак становіцца не толькі захапляльным, але і прыгожым відовішчам. Бронзавы прызёр чэмпіянату свету сярод юніёраў, уладальнік «серабра» і «бронзы» чэмпіянату Еўропы сярод юніёрак і кадэтаў, Яўгенія Андрэйчыкава развейвае ўсе памылковыя стэрэатыпы, звязаныя з барацьбой і спортам у цэлым.**



Фота: Беларуская федэрацыя барацьбы.

**— Жэня, чаму справай свайго жыцця ты зрабіла менавіта барацьбу?**

— Як звычайна бывае з усімі важнымі падзеямі, гэта адбылося выпадкова. Сяброўка пазвала схадзіць у новую спартыўную секцыю. А мы былі баявыя дзяўчынкі, і словы «вольная барацьба» для нас гучалі вельмі цікава і прывабна. На трэніроўках мы бегалі эстафеты, гулялі, было па-дзіцячы весела. А на першых спаборніцтвах я выйграла дзве схваткі, адну прайграла і не стала пераможцам. Тады мяне ўпершыню ўзяла спартыўная злосць, і я вырашыла, што павінна дасягнуць поспеху. Дарэчы, у сяброўкі, якая прывяла мяне ў барацьбу, спартыўная кар'ера не атрымалася. Мой першы трэнер Андрэй Пятровіч Барабанаў жыў са мной у адным доме, мы разам хадзілі на трэніроўкі. А я ў той час без іх ужо не магла. Вялікую ролю адыграла і тое, што ў маім родным Бабруйску адна з найлепшых школ вольнай барацьбы ў краіне. Узорамі для пераймання для нас былі Вольга Хілько, Ванэса Каладзінская, Заліна Седакова, двухкратны прызёр чэмпіянатаў свету. Іра Курачкіна, якая ўжо мае алімпійскую ліцэнзію ў Токіа, таксама з намі трэніравалася. У такіх умовах было цяжка не палюбіць барацьбу.

**— А бацькі як аднесліся да твайго выбару?**

— Яны былі задаволеныя, што я праводжу час на трэніроўках, а не на вуліцы. Тым больш, як я ўжо казала, я была непаседлівай, баявой дзяўчынкай і бацькам трэба было накіроўваць маю энергію ў правільнае рэчышча. Канешне, мае бацькі ганарацца мной і ўсяляк мяне падтрымліваюць. Малодшы брат пайшоў па маіх слядах і займаецца ў майго першага трэнера. Але ён яшчэ маленькі, і яму рана думаць аб прафесійнай кар'еры.

**— Прыходзілася сутыкацца з меркаваннем, што барацьба — гэта не жаночы спорт?**

— Гэта любімыя словы маіх бабуль, дзядуляў і школьных настаўнікаў. Але я ніколі не звяртала на іх увагі. Мне падабаецца, што я раблю, мяне гэта натхняе, астатняе не мае значэння. У раннім узросце падобныя выразы яшчэ могуць выклікаць нейкія сумненні. А потым гэта становіцца любімай работай, для спартсменаў нават сэнсам жыцця. І ўжо не важна, што кажуць людзі. Напрыклад, асабістаму жыццю барацьба ніколі не перашкаджала. Маладыя людзі не баяцца, што я ў добрай фізічнай форме *(смяецца)*.

**— З якімі стэрэатыпамі адносна барацьбы ты сустракалася?**

— Мабыць, самая вялікая памылка з тых, з якімі прыходзіцца сустракацца, датычыцца інтэлектуальных здольнасцяў спартсменаў. Чамусьці людзі лічаць, што нам, акрамя спорту, нічога не цікава. Але ж гэта зусім не так. Спартсмены — высокаразвітыя людзі. Мы пастаянна знаходзімся ў грамадстве, маем зносіны з людзьмі з розных краін, з журналістамі. Мы прадстаўляем краіну на ўвесь свет. Я бачыла вельмі мала замкнутых спартсменаў. Як правіла, гэта пазітыўныя, цікавыя людзі. Дарэчы, барцоў выдзяляе добрае пачуццё гумару, нам без яго нікуды. У нас фізічна цяжкая справа, і гумар дапамагае расслабіцца.

**— А што наконт стэрэатыпу аб паламаных вушах барцоў?**

— Гэта праўда жыцця, а не стэрэатып. У мяне таксама адно вуха зламанае. Наша «каронная» траўма залежыць ад удару. Ты «праходзіш» у ногі саперніка і б'ешся аб яго сцягно. Удар за ўдарам, і вуха заплывае вадкасцю, якую трэба адкачваць. Не самыя прыемныя адчуванні, але калі своечасова звярнуцца да доктара і выконваць яго назначэнні, можна астацца з прыгожым вушкам.

**— Жэня, барацьба моцна змяніла твой характар?**

— Спорт увогуле змяняе характар і ўсё жыццё. На дыване мы аднаасобнікі і думаем толькі аб сабе, аб сваёй перамозе. І я заўважаю, што часам паводжу сябе так і па-за пляцоўкай. Мне абавязкова патрэбна, каб усё было па-мойму. Як у анекдоце: ёсць толькі два меркаванні — маё і няправільнае. На шчасце, такое здараецца рэдка. Я імкнуся саступаць, слухаць людзей, якія вакол мяне. Калі патрэбна, нават магу пераступіць цераз сябе. Барацьба, як і любы іншы спорт, загартавала характар. Спартсмен ніколі не спыняецца на дасягнутым і можа адстойваць сваю пазіцыю. Мы ўмеем паводзіць сябе ў грамадстве, дастойна паводзіць сябе ў канфліктных сітуацыях. Спорт вучыць быць адэкватнымі і ветлівымі людзьмі.

**— Барацьба — гэта, перш за ўсё, саперніцтва і канкурэнцыя, а дружбе ёсць месца ў вашым спорце?**

— Канешне, мы шмат часу праводзім разам на зборах, на трэніроўках, як тут не пасябраваць? Быў момант, калі я баролася са сваёй найлепшай сяброўкай. Проста патрэбна настроіцца на тое, што канкрэтна ў гэтую хвіліну вы саперніцы. На спаборніцтвы прыязджаюць не сяброў заводзіць, а бароцца, і гэта трэба прыняць. А пасля схватак можна і нават трэба разам кавы выпіць, пагаварыць.

**— Як пандэмія каранавіруса паўплывала на тваю работу ў гэтым сезоне?**

— Мяне яна закранула непасрэдна, таму што я захварэла на каранавірус. Мабыць, у нас здарылася ўспышка інфекцыі і ніхто аб гэтым не ведаў. А паколькі барацьба — кантактны від спорту, зразумела, што ўсе мы заразіліся. На шчасце, у мяне хвароба прайшла без ускладненняў — крыху балела галава. А так у нас адмянілі чэмпіянат Еўропы сярод дарослых, чэмпіянат Еўропы сярод моладзі і кадэтаў U-23 таксама не адбыўся. Скамечаны сезон. Але нічога, працуем. Я хоць і адношуся яшчэ да катэгорыі U-23, але ўжо два гады выступаю і на дарослым узроўні. А там вельмі моцныя спартсменкі, і трэба шмат выкладвацца, каб дайсці да іх узроўню. Вось я і напрацоўваю форму.

**— Жэня, што табе дапамагае не здавацца і кожны дзень прыходзіць на трэніроўкі?**

— Я не буду надта арыгінальнай. Усе спартсмены трэніруюцца дзеля алімпійскага медаля. Дзеля яго шмат ахвяр, поту і слёз. Трэба штодзень пераломваць сябе, каб падняцца наверх. Але медаль Алімпійскіх гульняў таго каштуе.

**Валерыя СЦЯЦКО.**




ДОПОЛНИТЕЛЬНОЕ ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ» 3 сентября 2020 года на 14-ом открытом аукционе проводит 12-й от 13 августа 2020 года и 13-й от 20 августа повторные открытые аукционы по продаже имущества республиканской собственности**

| Номер лота | Наименование техники | Местонахождение объекта | Начальная цена продажи (бел. руб.) | Сумма задатка (бел. руб.) |
|---|---|---|---|---|
| 126 | Специальный автомобиль ГАЗ-66 с кузовом-фургоном К-66Н в составе: кузов-фургон К-66Н № 141083, 1983 г., *4 кат.*, автошасси ГАЗ-66, ш. 0336923, дв. 206578, 1983 г., *4 кат.*, *6035 км* | г. Осиповичи, в/ч 01313 | 3 800,00 | 760,00 |
| 128 | Гусеничное шасси МТ-Лбу (демилитаризованное), ш. 108403044 дв. 863040, 1984 г., *4 кат.*, *3277 км* | н. п. Станьково филиал, в/ч 25819 | 70 000,00 | 14 000,00 |
| 129 | Гусеничное шасси МТ-Лбу (демилитаризованное), ш. 108205011, дв. 752240, 1982 г., *4 кат.*, *1808 км* | н. п. Станьково филиал, в/ч 25819 | 75 000,00 | 15 000,00 |
| 130 | Гусеничное шасси МТ-Лбу (демилитаризованное), ш. 108409005, дв. 886928, 1984 г., *4 кат.*, *4652 км* | н. п. Станьково филиал, в/ч 25819 | 70 000,00 | 14 000,00 |
| 131 | Гусеничное шасси МТ-Лбу (демилитаризованное), ш. 108205024, дв. 750243, 1982 г., *4 кат.*, *2932 км* | н. п. Станьково филиал, в/ч 25819 | 70 000,00 | 14 000,00 |
| 132 | Гусеничное шасси МТ-Лбу (демилитаризованное), ш. 108512002, дв. 961260, 1985 г., *4 кат.*, *2559 км* | н. п. Станьково филиал, в/ч 25819 | 75 000,00 | 15 000,00 |
| 133 | Гусеничное шасси МТ-Лбу (демилитаризованное), ш. 108401006, дв. 845716, 1984 г., *4 кат.*, *3221 км* | н. п. Станьково филиал, в/ч 25819 | 70 000,00 | 14 000,00 |
| 134 | Гусеничное шасси МТ-Лбу (демилитаризованное), ш. 108408054, дв. 883625, 1984 г., *4 кат.*, *6952 км* | н. п. Станьково филиал, в/ч 25819 | 70 000,00 | 14 000,00 |

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Казинца, д. 2, 6-й этаж **3 сентября 2020 г. в 10.00.**

К участию в аукционе допускаются юридические лица, индивидуальные предприниматели и физические лица, оплатившие задаток, гарантийный депозит и подавшие заявление на участие в аукционе, соглашение, учредительные и другие необходимые документы **до 15.00 31 августа 2020 года**.

Заключительная регистрация участников аукциона будет производиться **3 сентября 2020 г. с 9.00 до 9.45.**

**Победитель аукциона обязан:**

1. Заключить договор купли-продажи не позднее 3-х банковских дней с момента проведения аукциона.

2. Произвести оплату стоимости движимого имущества разовым платежом в течение **5** банковских дней для резидентов Республики Беларусь и **10** банковских дней для нерезидентов Республики Беларусь со дня подписания договора купли-продажи.

Задаток, указанный в таблице, а также гарантийный депозит в размере 300,00 белорусских рублей за участие по каждому лоту и денежные средства за выигранное имущество перечисляются на расчетный счет РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ»:
белорусские рубли – р/с BY12BELB30120002R20010226000, российские рубли – р/с BY64BELB30120002R20040226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», ул. Заславская, 10, код BELBBY2X, УНП 101099370, ОКПО 37401662. Корреспондент – ПАО Сбербанк, г. Москва, № корсчета 30101810400000000225. Реквизиты банка: БИК 044525225, ИНН 7707083893, к/с в ОАО «Банк БелВЭБ» № 30111810800000000659. SWIFT/BIC: SABRRUMM. Без НДС.

**Справки по тел./факс: (017) 398 05 41.**

*Ранее опубликованное извещение в газете «Звязда» № 125 от 30.06.2020 г., № 136 от 16.07.2020.*

# ЗЯМЛЯ КУПАЛЫ

## КРАПІВА, КУПАЛА, СЫМОН БУДНЫ...

Уздзеншчына спакон веку цесна звязана з літаратурай і наогул з мастацтвам. Менавіта тут у 1572 годзе Сымон Будны піша ўступ да сваёй Біблії на беларускай мове, а асветнікі браты Кавячынскія — прысвячэнне да яе. Ну, а служыцеляў муз — паэтаў, пісьменнікаў, музыкаў, акцёраў, мастакоў — адсюль выйшла столькі, што рэгіён называюць «салаўіным краем».

У старадаўнюю частку Узды я прыехала, каб убачыць касцёл Святога Крыжа, пабудаваны ў 1798 годзе. Дарэчы, у школе пры касцёле вучыўся знакаміты паэт Тамаш Зан. А 12 мая 1846 года, расказала мне дырэктар мясцовага музея, у касцёле Святога Крыжа быў ахрышчаны Дамінік Луцэвіч, бацька Янкі Купалы.

**Музейны супрацоўнік — гэта глыбока адукаваны чалавек, а зарплата, якую яму могуць прапанаваць па спецыяльнасці, вельмі малая.**

Род Луцэвічаў вядомы з пачатку XVII стагоддзя. Дзед вялікага паэта паходзіў з дробнай шляхты. Не здолеўшы пацвердзіць дваранства, сям'я ператварылася проста ў беззямельных сялян. Арандавалі зямлю ў князёўны Гоген-Гоген з роду Чапскіх бліз вёскі Літва (там ёсць хутар Пяскі). Займаліся сельскай гаспадаркай: гадавалі жывёлу і вырошчвалі збожжа. Былі добрымі каталікамі, жылі цяжкай працай, стараліся даць дзецям «пуцёўку ў жыццё» — Дамінік Луцэвіч скончыў езуіцкі калегіум, які даваў адукацыю еўрапейскага ўзроўню. Словам, самая звычайная, простая сям'я, у якой, (ужо пасля пераезду яе пад Маладзечна), нарадзіўся незвычайна таленавіты хлопчык. Чаму так адбылося? Вядома, склаліся многія фактары. Але, магчыма, сказалася і асаблівая, няўлоўная і невытлумачальная «мастацкая радыяцыя» Уздзеншчыны, адкуль з пакалення ў пакаленне традыцыйна выходзяць таленавітыя людзі — у радыяцыі ж, вядома, няма ні смаку, ні выгляду, ні паху, адно толькі ўздзеянне. Дарэчы, Уздзеншчыне прысвячаў свае радкі і іншы найвялікшы класік нашай літаратуры — Якуб Колас: «*Не-не ды ўспомню зноў той кут, дзе я даўно сагрэты быў пяскамі Наднямоння*».

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)



Новы касцёл пабудаваны побач са старадаўнім.

У нашы дні вёску Літва ўспамінаюць па Уздзе ў першую чаргу не ў сувязі з родам Купалы. Там размяшчаецца ЗАТ «АСБ-Агра Кухцічы». І многія гарадскія жыхары ездзяць туды працаваць — гаспадарка прапануе досыць высокія зарплаты.

## КАСЦЁЛ І НАВАКОЛЛІ

Старажытны касцёл стаіць дагэтуль. Праўда, на касцёл ён цяпер падобны мала — 1935 год пачаў па ўсім Савецкім Саюзе так званую бязбожную пяцігодку. У тым годзе ў уздзенскім касцёле быў дэманціраваны і вывезены самы вялікі ў Беларусі арган. Бясследна знік і алтар, які ўяўляў вялікую мастацкую каштоўнасць. А потым больш за 70 гадоў у будынку храма размяшчаўся мясцовы Дом культуры. Каб нічога не нагадвала пра тое, што раней тут быў касцёл, у савецкія гады велізарны будынак абшылі дрэвам, прымайстравалі недарэчныя калоны і порцік над уваходам. Тут праводзіліся атэістычныя лекцыі, а ў 1990-я і 2000-я — дыскатэкі, на якія збіралася ўся уздзенская моладзь.

Але старадаўнія каваныя вароты засталіся ранейшыя. Сёння будынак у аварыйным стане. Вернікі прасілі вярнуць касцёл, але насустрач ім не пайшлі. Аварыйны будынак выкупіў прадпрымальнік, які займаецца вытворчасцю свечак. Сёння там праводзяцца рамонтныя работы, расказалі мясцовыя жыхары. Частка будынка ўжо адрамантавана, там робяцца свечкі для цэркваў. Новы касцёл — маленькі, чысценькі і сімпатычны — не так даўно з'явіўся побач са старадаўнім.

А дом у вёсцы Забалацце побач з горадам Узда, дзе нарадзіўся Дамінік Луцэвіч, да нашых дзён не захаваўся, расказала **дырэктар мясцовага краязнаўчага музея Тамара ЛУХВЕРЧЫК.** Ды гэта было б проста немагчыма. Яшчэ стагоддзе таму вёскі час ад часу выгаралі: пячное ацяпленне і драўляная забудова... Напрыклад, вёска Нізок, дзе нарадзіўся Кандрат Крапіва, была перабудавана цалкам на іншым месцы. Першапачаткова вёска стаяла на пагорку і загарэлася ад маланкі, таму перабудавалі яе ў больш нізкім месцы. У гэтай вёсцы яшчэ нядаўна размяшчаўся філіял Уздзенскага краязнаўчага музея — дом-музей Кандрата Крапівы. Але цяпер музея ўжо няма. Вёска памірае, трымаць там музейныя экспанаты і штат супрацоўнікаў немэтазгодна. Тым больш што зацікавіць музейных работнікаў сёння складана. Музейны супрацоўнік — гэта глыбока адукаваны чалавек, а зарплата, якую яму могуць прапанаваць па спецыяльнасці, вельмі малая. Адпрацаваўшы належны тэрмін па размеркаванні, людзі шукаюць сабе больш высокааплатную работу ў іншых сферах.

## СУЧАСНАСЦЬ І ГАРАДСКІЯ ЛЕГЕНДЫ

Па другі бок шашы знаходзіцца сучасная частка горада. Тыпавая пяціпавярховая забудова (некаторыя з гэтых дамоў будаваў МАПІД), адміністрацыйны будынкі, універмаг, банк. Ёсць ва Уздзе і раён катэджнай забудовы. Зразумела, маецца і абавязковы для маленькіх гарадкоў Ленін — тут ён (мініяцюрны для статуі) пафарбаваны серабрыстай фарбай і чамусьці выглядае трошачкі збянтэжаным.



Старажытны касцёл, дзе быў ахрышчаны Дамінік Луцэвіч, бацька Янкі Купалы. Больш за 70 гадоў у будынку храма размяшчаўся мясцовы Дом культуры.

Буйных прадпрыемстваў у горадзе няма, ды і машын на вуліцах няшмат. Такім чынам, з работай напружана, але ёсць і бонусы: свежае паветра і экалагічна чыстыя прадукты ў гародах і на мясцовым рынку. Дарэчы, менавіта ў Уздзенскім раёне бярэ пачатак выток ракі Нёман (па якім праходзіў старажытны гандлёвы шлях «з варагаў у грэкі»), а больш за трэць раёна занята лясамі. Уздзенцы кажуць, у апошнія гады сюды час ад часу перазджаюць жыць расіяне — адносна небагатыя сем'і, якія жадаюць збегчы ад узрушэнняў, працаваць аддалена (ці жыць на назапашаныя зберажэнні) і спакойна гадаваць дзяцей.



Уздзенская «піраміда», склеп роду Завішаў.

Як і ў кожным старадаўнім горадзе, існуюць тут свае легенды. Адна з іх звязана з размешчанымі непадалёк развалінамі сядзібы «беларускага Тэслы» Якава Наркевіча-Ёдкі, якая цяпер рэканструюецца. Мясцовыя жыхары расказваюць, што галоўная вежа сядзібнага дома, якой удалося перажыць Вялікую Айчынную вайну, у 1994 ці 1995 годзе была падараваная... крымінальным аўтарытэтам. Той хацеў пабудаваць у маляўнічым месцы над Нёманам уласную вілу, а гістарычны помнік вырашыў проста знішчыць, каб не перашкаджаў. Але ў пазамінулым стагоддзі будавалі як мае быць, сцены паваліліся толькі часткова, а чаму спыніліся далейшыя «выбуховыя работы», гісторыя замоўчвае.

Склеп-піраміда — яшчэ адна славутасць гарадка. Пахавальня ў выглядзе каменнай піраміды накшталт магільняў егіпецкіх фараонаў (у паменшаным, зразумела, варыянце) вызначае гарадскія могілкі з 1800 года. Яна была пабудавана магнацкім родам Завішаў. У тыя часы гісторыя, старажытная рэлігія і містычныя вучэнні Егіпта былі ў модзе сярод арыстакратаў Еўропы. Не засталася ў баку ад гэтай моды і арыстакратыя Рэчы Паспалітай, тым больш што яе шляхта прымала ўдзел у паходзе Напалеона ў Егіпет. Сам склеп знаходзіцца ўнізе, а наверсе будынка ёсць яшчэ адно маленькае памяшканне — магчыма, яго выкарыстоўвалі для спірытычных сеансаў.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**


## Извещение о проведении аукциона по продаже гражданам Республики Беларусь в частную собственность не завершенного строительством незаконсервированного одноквартирного жилого дома и земельного участка в аг. Жемчужный, по ул. Каштановая, 12

1. **Аукцион состоится 24 сентября 2020 года в 15.00 по адресу: 225409, Брестская обл., г. Барановичи, ул. Советская, 79, каб. 302.**

2. Порядок проведения аукциона установлен Положением о порядке продажи не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, дач с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 23 марта 2018 г. № 220 «О некоторых мерах по реализации Указа Президента Республики Беларусь от 26 декабря 2017 г. № 463».

3. Прием заявлений об участии в аукционе осуществляется по адресу: 225316, Брестская обл., Барановичский р-н, агрогородок Жемчужный, ул. Ленина, 3 с понедельника по пятницу с 8 до 17 часов, обеденный перерыв с 13 до 14 часов. **Начало приема заявлений – 25 августа 2020 г. Последний день приема заявлений – 21 сентября 2020 г. включительно.**

4. Для участия в аукционе граждане, (лично либо через своего представителя) в установленный в извещении срок подают заявление об участии в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков, которые они желают приобрести в частную собственность, представляют документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении, с отметкой банка.

Кроме того, в комиссию представляются:

- гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования;
- представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.

5. При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь. При подаче документов уполномоченное лицо (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, и доверенность, выданную в установленном законодательством порядке.

6. **Лот № 1:** земельный участок с кадастровым номером 120481503601000434, расположенный по адресу: Республика Беларусь, Брестская область, Барановичский р-н, Жемчужненский с/с, аг. Жемчужный, ул. Каштановая, 12, площадью 0,1525 га, в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (код 1 09 02, земельный участок для размещения объектов усадебной застройки). Незавершенное незаконсервированное капитальное строение без инвентарного номера, площадью застройки 169 кв. м, степенью готовности – 12 %. Обеспечение инфраструктурой согласно градостроительному паспорту (имеется возможность подключения к элементам электроснабжения, газоснабжения и водоснабжения). Состояние дорожной сети: грунтовое покрытие улицы.

Начальная цена земельного участка составила 10 587,28 белорусского рубля, в том числе начальная цена не завершенного строительством жилого дома – 7732,48 белорусского рубля, земельного участка при его продаже в частную собственность – 2854,80 белорусского рубля.

7. Затраты на организацию и проведение аукциона составили: регистрация прекращения права – 72,90 бел. руб., расходы на оценку не завершенного строительством жилого дома – 186,35 бел. руб., объявления в СМИ о проведении аукциона согласно актам выполненных работ.

Размер задатка составляет **1058,73** бел. руб. Задаток вносится на р/с № BY25AKBB36412110500311300000 в филиале 802 ОАО АСБ «Беларусбанк» в г. Барановичи, БИК AKBBBY21802, УНП 200046491 **по 21 сентября 2020 г. включительно.**

Затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и представлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, возмещаются победителем аукциона Жемчужненскому сельскому исполнительному комитету. В течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона победитель обязан внести плату за земельный участок, возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и представлением участникам документации, необходимой для его проведения, и выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона, которые подлежат выполнению до обращения за государственной регистрацией в отношении земельного участка.

Размер штрафа, уплачиваемый в случаях, предусмотренных положением о порядке продажи не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, дач с публичных торгов, утвержденным Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 23 марта 2018 г. № 220 «О некоторых мерах по реализации Указа Президента Республики Беларусь от 26 декабря 2017 г. № 463» и составляет 1350,00 белорусских рублей.

8. Осмотр земельных участков, выставляемых на аукцион, производится в день и время, согласованные с продавцом.

9. Адрес комиссии: 225316, Брестская обл., Барановичский р-н, агрогородок Жемчужный, ул. Ленина, 3, контактные телефоны для справок: 8-0163-65-60-23, 8-0163-65-60-17, 8-029-131-03-89 (А1).

10. Для участия в аукционе необходимо в сроки, указанные в извещении, представить в адрес комиссии следующие документы:

- заявление об участии в аукционе;
- заверенную копию платежного документа (задаток);
- доверенность, удостоверенную нотариально, если в аукционе участвует представитель физического лица.

11. Аукцион проводится аукционистом при наличии двух или более участников.

12. Информация об объектах, предлагаемых к продаже, размещена на сайтах Барановичского райисполкома **baranovichi.brest-region.gov.by,** Брестского облисполкома **brest-region.gov.by** и Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь **au.nca.by.**

Прыгажосць

# ТАМ ЛІЛЕІ ЦВІТУЦЬ...

## У двух гродзенскіх мікрараёнах узнавілі вадаёмы

**Работы па добраўпарадкаванні двух знакавых вадаёмаў горада пачаліся вясной. За некалькі месяцаў водныя аб'екты пачысцілі, засыпалі грунтам. Дно заслалі спецыяльнай плёнкай. Катлаван запоўнілі вадой і нават высадзілі водныя лілеі.**

Некалі вадаёмы былі месцам масавага адпачынку гараджан. Паабапал іх стаялі лаўкі, былі пракладзены дарожкі, дзе любілі гуляць мамы з калясkамі і гараджане з дзецьмі. Але з цягам часу абодва штучныя аб'екты высахлі і зараслі балотнай травой. Гараджане неаднаразова звярталіся да гарадскіх улад, каб іх «ажывіць» і прывесці ў парадак. І вось сёлетняй вясной камунальныя службы прыступілі да рэалізацыі праекта. Як расказаў **намеснік генеральнага дырэктара Гродзенскай гарадской ЖКГ Сяргей СЯМАШКА,** у праект добраўпарадкавання ўнесены пэўныя змены. Так, вадаём на вуліцы Рэпіна крыху зменшыўся, а вакол яго высаджаны дрэвы і кустоўе. На вуліцы Курчатава замест дзвюх зарослых сажалак зрабілі адзін вялікі аб'ект. Ёсць план абсталяваць тут спартыўна-гульнявы комплекс. Па перыметры вадаёмаў устаноўлены металічныя агароджы, з'явіліся альтанкі.



Фота grodnonews.

Самым складаным, па словах прадстаўніка камунальнай службы, было змяненне гідраізаляцыйных характарыстык. Вада ішла праз дно ў глыбіню, таму фундамент вадаёма выкладваўся ізаляцыйнай плёнкай. Каб захаваць чысціню вады, прадпрыемства «Зеленбуд» занялося высадкай раслін, якія садзейнічаюць ачышчэнню вады і будуць падтрымліваць экасістэму ў норме. Спецыялісты паведамілі, што прадпрыемства закупіла пяць сартоў водных лілей чырвонага, ружовага і белага колераў, а таксама два сарты жоўтага. Расліны высадзілі ў скрынкі з грунтам і камянямі і апусцілі на дно, у хуткім часе на паверхні павінны з'явіцца лісты і распусціцца бутоны.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

# НОВАЯ ДАРОГА Ў «СПАЛЬНЮ» ВІЦЕБСКА...

***(Заканчэнне.***
***Пачатак на 1-й стар.)***

Бацька дзятвы сказаў, што дарога вельмі неабходная. Насамрэч, пакуль што нязручна на аўто і грамадскім транспарце ехаць некалькі кіламетраў з Білева да праспекта Будаўнікоў. Мужчына згадаў, што раней на месцы, дзе цяпер асфальт, была гара і вялікае поле з пустазеллем, смеццем, балотцамі. Нармальныя людзі тут не хадзілі.

Пакуль што, каб трапіць у Білева з боку «Віцязя», трэба павярнуць на вуліцу П. Броўкі, потым — на Маскоўскі праспект, і там трэба зноў паварочваць, каб выехаць на Караткевіча. Дарэчы, толькі па Маскоўскім пакуль што можна выехаць за межы горада, у бок аэрапорта, а недалёка ад яго — так званае воранаўскае кальцо, па якім едуць у розныя напрамкі. Загрузка вялікая. Зразумела, як кажуць, «наварочваць кругі» — толькі час і бензін траціць, у часы пік з-за адсутнасці «прамой» не рэдкасцю сталі дарожныя заторы... Па дарозе запланавала запусціць тралейбусы, якія могуць рухацца на аўтаномным ходу. Гэтыя электробусы значна аблегчаць нагрузку на іншыя віды транспарту ў Білеве.

Прадстаўнікі будаўнічых арганізацый, якія працуюць на аб'екце, удзячны гарадской і абласной уладам за своечасовае фінансаванне, бо не прыходзіцца чакаць будаўнічыя матэрыялы ды канструкцыі. На аб'екце ў самыя напружаныя дні заўважалася пад пяцьдзясят бульдозераў, экскаватараў, каткоў для ўкладкі дарожнага пакрыцця...



Адным з самых цяжкіх аказалася вырашэнне пытання так званага вынасу інжынерных сетак. Было прадумана, як лагістычна правільна, без адключэння падачы дзясяткам тысяч спажыўцоў, «ператрасіраваць», пракласці, «узмацніць» электрычныя кабелі, сістэмы падачы вады і газу, праводку сістэм сувязі...

Пасля рэканструкцыі паралельна адкрыюць і недабудаваны падземны пераход, што ў месцы, дзе пачынаецца новае дарожнае палатно. Старажылы памятаюць, што ён з'явіўся яшчэ ў другой палове 1980-х, але разбурэнне СССР перашкодзіла рэалізацыі задуманага. У выніку пераход ператвараўся ў брудны вадаём. Некаторыя віцябляне сцвярджаюць, што там добра лавілася рыбка. «Канструкцыю» ніжэй узроўню асфальту планавалі, мякка кажучы, прывесці ў парадак яшчэ ў мінулым стагоддзі не раз. Але ўсё не атрымлівалася з-за недахопу фінансавання...



Яшчэ пра білеўскую тэматыку. Падарункам для жыхароў стане і новая (другая па ліку ў мікрараёне) сярэдняя школа з ліфтам і двума басейнамі. Там жа, што цікава, узводзіцца адзін з самых вялікіх у Еўропе заапаркаў. Білева вядома і тым, што тут функцыянуе знакамітае кандытарскае прадпрыемства «Віцьба».

Дарэчы, пра дарожнае пытанне ў абласным цэнтры наогул. Нагадаю, што нядаўна адкрылі рух па Полацкім пуцеправодзе (знаходзіцца каля чыгуначнага і аўтамабільнага вакзалаў), які ў фенаменальна хуткі тэрмін — каля дваццаці месяцаў — капітальна рэканструявалі. Гэтая канструкцыя сустрэнецца на шляху тых, хто едзе ў Віцебск з Латвіі і Расіі. Паралельна далі новае жыццё дарозе на гэтым аб'екце і тым, што побач.

Літаральна праз некалькі дзён будаўнікі распачалі работы на вуліцы Гагарына, якая таксама з'яўляецца адной з брам горада. Дарэчы, цікава, што да 1848 года яна была адзінай дарогай на Санкт-Пецярбург і мела назву Беларускі тракт... У імправізаванай планёрцы ў пачатку вуліцы Гагарына ўзяў удзел старшыня Віцебскага аблвыканкама Мікалай Шарснёў. Ён, дарэчы, падчас прамых ліній пастаянна чуе сігналы наконт неабходнасці рамантаваць дарогі. Што датычыцца Віцебска, губернатар паставіў задачу кіраўніцтву гарвыканкама: шчыльна ўзяцца за навядзенне парадку на дарогах прыватнага сектара. Гараджане, якія жывуць у прыватным жыллі, спадзяюцца, што і на іх вуліцах будзе святла.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**
**Фота аўтара.**


ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА
по продаже не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, в том числе не завершенных строительством жилых домов, сроки консервации и завершения строительства которых истекли, с одновременной продажей земельных участков в частную собственность

**Организатор:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, проезд Гоголя, дом 5, тел. (0212) 24-63-12

**Лот № 1.** Не завершенный строительством незаконсервированный жилой дом (процент готовности – 59 %: фундамент – сваи, панели железобетонные, железобетон; площадь застройки 64 кв. м,) и земельный участок с кадастровым № 240100000003001978, площадью 0,1472 га, в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. 1-я Зеленогурская, 3. Ограничения: санитарно-защитные полосы водоводов, охранные зоны линий связи и радиофикации.
**Начальная цена предмета аукциона** (в т. ч. не завершенный строительством жилой дом/зем. участок): **51425,61** (4527,69/46897,92) бел. руб. **Задаток: 5142** бел. руб. Удельный вес стоимости не завершенного строительством жилого дома в начальной цене предмета аукциона – 8,8 %

**Лот № 2.** Не завершенный строительством незаконсервированный жилой дом (процент готовности основного здания – 6 %: фундамент – бетон, вход в цокольный этаж; процент готовности цокольного этажа – 85 %: наружные стены – бетон, перегородки кирпичные, бетонные, перекрытие ж/б, полы бетонные, двери металлические, деревянные, имеются электротехнические устройства; площадь застройки – 127 (149) кв. м) и земельный участок с кадастровым № 240100000002006852, площадью 0,0982 га, в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. 2-я Магистральная, 21. Ограничения: водоохранная зона водного объекта (р. Питомка).
**Начальная цена предмета аукциона** (в т. ч. не завершенный строительством жилой дом/зем. участок): **30176,93** (13541,85 /16635,08) бел. руб. **Задаток**: 3017 бел. руб. Удельный вес стоимости не завершенного строительством жилого дома в начальной цене предмета аукциона – 44,87 %

**Лот № 3**. Не завершенный строительством незаконсервированный жилой дом (строительство начато с принадлежностей к жилому дому, процент готовности хозяйственной постройки (сарая) – 31 %: фундамент бетонный, площадь застройки 10 кв. м) и земельный участок с кадастровым № 240100000002006884, площадью 0,0938 га, в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. 8-я Чепинская, 64.
**Начальная цена предмета аукциона** (в т. ч. не завершенный строительством жилой дом/зем. участок): **18112,93** (394,11 /17718,82) бел. руб. **Задаток:** 1811 бел. руб. Удельный вес стоимости не завершенного строительством жилого дома в начальной цене предмета аукциона – 2,18 %

**Лот № 4**. Не завершенный строительством законсервированный жилой дом (капитальное строение с инв. № 200/U-101281), наименование – не завершенное законсервированное капитальное строение, назначение – здание неустановленного назначения (процент готовности основного строения – 36 %: фундамент – бутобетон, стены – блоки газосиликатные, перекрытия деревянные балки, процент готовности мансарды – 24 %: наружные стены – блоки газосиликатные; площадь застройки – 88 кв. м) и земельный участок с кадастровым № 240100000002007747, площадью 0,0938 га, в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома по адресу: Витебская обл., г. Витебск, 8-я Чепинская, 58.
**Начальная цена предмета аукциона** (в т. ч. незавершенный законсервированный дом/зем. участок): **36100,58** (18381,76 /17718,82) бел. руб. **Задаток: 3610** бел. руб. Удельный вес стоимости не завершенного строительством жилого дома в начальной цене предмета аукциона – 50,92 %

**Лот № 5.** Не завершенный строительством незаконсервированный жилой дом (строительство начато с принадлежностей к жилому дому, процент готовности хозяйственной постройки (гаража) – 24 %: фундамент свайно-набивной, площадь застройки 35 кв. м; процент готовности хозяйственной постройки (бани) – 14 %: фундамент – сваи металлические, площадь застройки – 22,4 кв. м) и земельный участок с кадастровым № 240100000001012073, площадью 0,0947 га, в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. 1-я Фестивальная, 9. Ограничения: водоохранная зона водного объекта.
**Начальная цена предмета аукциона** (в т. ч. не завершенный строительством жилой дом/зем. участок): **17805,50** (1763,32/16042,18) бел. руб. **Задаток: 1780** бел. руб. Удельный вес стоимости не завершенного строительством жилого дома в начальной цене предмета аукциона – 9,9 %

**Лот № 6.** Не завершенный строительством незаконсервированный жилой дом (процент готовности основного строения – 12 %: фундамент – сваи железобетонные, железобетон, площадь застройки 126 кв. м) и земельный участок с кадастровым № 240100000001010169, площадью 0,1002 га, в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома) по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. 3-я Магистральная, 14. Ограничения: водоохранная зона водного объекта (река Питомка).
**Начальная цена предмета аукциона** (в т. ч. не завершенный строительством жилой дом/зем. участок): **27470,43** (10496,55/16973,88) бел. руб. **Задаток: 2747** бел. руб. Удельный вес стоимости не завершенного строительством жилого дома в начальной цене предмета аукциона – 38,22 %

**Дата, время и место проведения повторного аукциона: 11.09.2020 в 15.00** по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». **Срок внесения задатка и приема документов: с 8.30 19.08.2020 до 17.30 09.09.2020 в рабочие дни по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Задаток перечисляется на р/с:** BY14AKBB36423020002802000000 ф-л № 200 ВОУ ОАО «АСБ «Беларусбанк», БИК AKBBBY21200, УНП 300200386, получатель платежа: Витебский горисполком. **Условия для победителя аукциона либо единственного участника:** в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона либо после признания аукциона несостоявшимся: внести плату за предмет аукциона, возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в т. ч. расходы, связанные с изготовлением и представлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения; в течение 2 месяцев со дня утверждения в установленном порядке протокола аукциона обратиться за государственной регистрацией права на земельный участок в РУП «Витебское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру»; получить в установленном порядке разрешение на проведение проектно-изыскательских работ и строительство объекта; разработать проект на строительство объекта в срок, не превышающий 6 месяцев; к строительству жилого дома приступить после согласования в установленном порядке проектной документации; осуществить строительство объекта в сроки, установленные действующим законодательством. Рассрочка внесения платы за земельный участок предоставляется в порядке, установленном законодательством.
Назначение зем.участков в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества: 1 09 02 – размещение объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по государственной регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме). Инженерные коммуникации и сооружения на земельных участках отсутствуют. Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории устанавливаются проектной документацией

Аукцион проводится в порядке, установленном Положением о порядке продажи не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, дач с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 23.03.2018 № 220. Для участия в аукционе приглашаются граждане Республики Беларусь, негосударственные юридические лица Республики Беларусь, консолидированные участники (двое и более граждан Республики Беларусь, негосударственных юридических лиц Республики Беларусь), которые в установленный в извещении срок подают заявление об участии в аукционе с указанием предмета аукциона, представляют документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/счет, указанный в извещении, с отметкой банка, заключают с организатором аукциона соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Представляются: гражданином Республики Беларусь – копия документа, удостоверяющего личность; представителем гражданина Республики Беларусь – доверенность; представителем или уполномоченным должностным лицом юр. лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов подтверждающих государственную регистрацию юридического лица, документ с указанием банковских реквизитов; консолидированными участниками – оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе и доверенность. Аукцион состоится при наличии не менее 2 участников в отношении каждого предмета аукциона. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Затраты на организацию и проведение аукциона, в т. ч. расходы, связанные с изготовлением документации, необходимой для его проведения, перечисляются на р/с, указанный в протоколе аукциона. Всем участникам предоставляется право ознакомления с документацией, а также возможность осмотра на местности предмета аукциона. **Конт. тел.: (0212) 24-63-12, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru; www.marketvit.by.**



**УВАЖАЕМЫЕ АКЦИОНЕРЫ**
**ОАО «Стройтрест № 1»!**

Решением внеочередного общего собрания акционеров от 17 августа 2020 года были установлены:
- размер начисленных дивидендов за первое полугодие 2020 года на одну акцию – 0,5997316 рубля;
- период выплаты дивидендов: до 22 сентября 2020 года;
- следующий порядок выплаты дивидендов:
- на долю собственности г. Минска – путем перечисления на расчетный счет финотдела администрации Первомайского района;
- акционерам – физическим лицам – через депозитарий ООО «Совмедиа» почтовыми переводами.

УНП 100288960

# СЦЕЖКІ, ШТО МЫ ВЫБІРАЕМ

**Вёска, вуліца, дыхтоўны дом, а ўжо плот...**
**Надпіс на брамцы: «Асцярожна! У двары злы сабака». І трэба ж — пыса яго, якраз пад «шыльдай», — паміж штыкецін...**
**Мелі шчасце паглядзець! Нават больш за тое — пагладзіць!**
**Добры сабака! І, відаць па ўсім, разумны-разумны.**
**Значыць, няпраўда на той брамцы напісана?**
**...І каб толькі там, пра сабаку.**




## Ад прадзедаў

Ці не бог нам госця паслаў — тутэйшага, беларускамоўнага, бялявага, у белым адзенні... Не ведалі спачатку, куды яго пасадзіць і чым пачаставаць.

— Чай, — спыталі, — ці кава?.. Што вы п'яце?

— Ды ў вас на рабоце, мусіць, няма таго?.. — разгубіўся ён.

— ?

— Ну, што продкі нашы пілі...

— ?

— ...Вады з варэннем. Ці з мёдам.

Яна, сцюдзёная (можна кубікі лёду ўкінуць), як аказалася, цудоўна бадзёрыць і наталяе смагу! «Гатуецца» — умомант, не каштуе нічога...

Проста. Як усё геніяльнае.

## Пакуль маўчаў

У Юлечкі новы паклоннік — высокі, цёмнавокі, шыракаплечы. Мы моўчкі і дружна ўхваляем: малайчынка, маўляў, такога хлопца падчапіла!

Дзеўка ў адказ моршчыць носік і махае рукой: пустое...

Сэнс гэтага слова мы разумеем пазней, калі хлопец адкрывае рот і пачынае нешта даводзіць. Неразумны, бядак... Але ж пакуль маўчаў, гэта непрыкметна было.

## Цяжкі выпадак

Былі часы — імя яго моцна грымела: за сотні вёрстаў людзі ехалі, бо, пісалі, здымаў нагаворы і псоту, варажыў, лёгка караў зламыснікаў, лячыў — іншых...

Але ж болька была і ў самога: з жонкай ну ніяк разысціся не мог. Мала таго, што яна забірала дзіця — «з канцамі» (муж каб нават не бачыў), дык хацела і астатняе ўсё загрэбці: кватэру, машыну, дачу, грошы...

Спрабаваў угаворваць, упрошваць, пераконваць, судзіцца і бездапаможна разводзіў рукамі: «Шалею, — казаў, — ад яе нахабства». І потым дадаваў, што з такімі магія бяссільная і паратунак адзіны — цагліну ў валёнак...

## З людзьмі...

У Яўгенавіча падстаў для гонару, мова, сто, а вось форсу, дык — ні на грам. З усімі ён, дырэктар, папросту: таго пра здароўе спытае, таго — пра дзяцей; з некім пажартуе, некага на працу ці з працы падвязе... Хоць на службовай машыне, хоць на сваёй...

Што не ўсе разумеюць.

Надоечы яго калега на прадпрыемстве быў — круты-круты, пальцы ўроскідку... Пакуль размаўлялі — час абеду настаў.

— Тут паблізу рэстаран ёсць. Я пазваню, каб нам столік накрылі? Разам папалуднуем, — прапанаваў госць.

— Не, — адмахнуўся гаспадар, — дзякуй, я ў сваёй сталоўцы прывык.

— І што, — здзівіўся госць, — там можна есці?

— Чаму ж не? Складзеш кампанію?..

Пакуль ішлі туды, з некім павіталіся-парукаліся, з некім паразмаўлялі, пастаялі ў чарзе...

Дарэчы, госця як падмянілі там. Казаў — гадоў 30 скінуў, у студэнцкую сталоўку трапіў — успомніў раздачу, падносы, салату з капусты, коржык, кампот...

З людзей і ў людзі выйшлі, як вядома, многія.

Ды не ўсе людзьмі засталіся.

## Тутэйшая

Гэта некалі ў цырульнях чэргі былі, сёння — папярэдні запіс, а то і без яго... Не паспеў зайсці, а ўжо на табе: «Сядайце, калі ласка!»

Утульнае крэсла. І побач — такое ж. Вось толькі жанчына ў ім нейкая дзіўная: твар чырвоны... Дыхае цяжка...

Заўважае гэта і майстрыха: дрыжачымі рукамі пачынае развязваць накінутую на шыю накідку.

— Ай-ё-ечкі, — лапоча, — я ж туга завязала. А вы нічога і не кажаце.

— Дык стрыжка ж, думаю, гэта не завійка — хутка зробім. Перацярплю.

Тутэйшая?

## Апытанне

Аднакласнікі, аднакурснікі ў «кантактах» «сыходзяцца» часта, — сустракаюцца куды радзей. Ну, хіба, па датах: праз пяць гадоў пасля выпуску, праз дваццаць. Асобныя — праз шэсцьдзясят...

З'ехаліся неяк дзесяць выпускніц філфака.

Адна — пад канец сустрэчы — нават апытанне правяла:

— Дзяўчаты, падыміце рукі, хто з вас гэтыя гады пражыў шчасліва? Ну хаця б аднясна...

Адна рука ўверсе... Потым — нясмела — другая... І трэцяя.

...Такое жыццё?

Ці ў нас такія адносіны?

## Ёсць логіка?

Былі часы... У пятніцу пасля працы мы садзіліся ў машыны і ехалі — у той жа Светлагорск, напрыклад.

Не, не ў наш, хоць і ён таго варты, — у такі ж дагледжаны і ўтульны гарадок Прыбалтыкі. Жылі там два дні на беразе мора, а ў нядзелю вярталіся. Ні табе віз, ні пашпартоў, ні мытняў. Да таго ж дарогай у любым месцы можна было смела збочыць у лес ці да рэчкі, паставіць намёт, развесці вогнішча, пераначаваць.

Адно — прыдарожны сервіс быў на нулі: ежу мы бралі з сабой, на зямлі рассцілалі абрус, садзіліся...

Цяпер ужо іншая рэч: кавярні ля дарог (хоць і не густа), нейкія буданкі са стрэшкамі, са сталамі-лаўкамі, скрынкамі для смецця, прыбіральнямі, а месцамі — нават з забаўкамі для дзяцей.

Спыняемся неяк у божым куточку. Толькі б стол накрываць, каб паснедаць, — гаспадар пад'язджае, ляснік. Мы тут жа з пытаннямі: а хто, маўляў, гэтыя карункі з дрэва выразаў, хто арэлі паставіць надумаў, хто драўляных грыбоў «насадзіў» і чыя, прынамсі, ідэя назву лясніцтва ў беларускім арнаменце напісаць па-руску?

— Дык элементарна ж, — не зразумеў здзіўлення гаспадар. — Будуць расіяне нейкія ехаць — спыняцца, адпачнуць. Ім жа прыемна будзе, што надпіс па-руску?

...Паводле логікі лесніка, каб прыемна было палякам, трэба надпіс зрабіць па-польску, немцам — па нямецку, англічанам — па-англійску...

Як пры гэтым будзе нам — справа дзясятая? Як, між іншым, і тое, што госці едуць да нас, каб убачыць, пачуць, пакаштаваць, зразумець нешта наша, а не сваё.

## Яны і мы

Брат — чалавек грунтоўны: няшмат што ён робіць, але ж калі робіць...

Неяк адкрыццём падзяліўся. Спытаў:

— Вось ты ведаеш, чаму ў цябе грыбы падгараюць, а ў мяне — ніколі?

— ?

— ...Таму што калі я вару грыбы, то я — вару грыбы, а ты...

Ці трэба гаварыць — у мяне, як ва ўсякай кабеты, адначасова «столькі работы, ну столькі работы!»

Каб лягчэй рабілася...

Двор (бальнічны). Лавак пустых няма. На нашу — двое падселі. Відаць, маці з дачкой. Пра нешта гамоняць — ціхенька-ціхенька, так, што голас мужчынскі — як гром:

— Мамаша, вы што сабе дазваляеце, га?! Гаварылі ж: сустрэнемся на прыпынку, потым удвах сюды. Я стаю там, чакаю. А вы?

— Ну не шумі! Вінавата, — губляецца «мамаша». — Я раней прыйшла — з работы адпрасілася. Думала, мы тут пасядзім крыху, пагаворым, а потым і ты далучышся.

— А як вы гэта ўяўляеце?.. Я ж, як дурань, там паўгадзіны стаю... Чакаю...

— Ну такой бяды, — заступаецца за маці дачка. — Падумаеш, пачакаў...

— І падумаеш!.. Дома столькі работы, столькі работы!

Жанчыны ўдзвюх:

— Ну якая ў цябе работа?

— Якая-якая?! Я шкарпэткі свае замачыў!

...Шчаслівы той, хто можа вось так «шчываваць»!

Як, зрэшты, і той, хто не можа. Вось гэтак.

## Ёсць сэнс?

Кацю ў бальніцу забралі — з малой. Ад'язджаючы, адкрыла халадзільнік, паказала мужу, што з'есці сёння, што заўтра.

Ён аж пакрыўдзіўся: я ж, маўляў, не малы. Неяк перакантуюся.

І кантаваўся — дні тры. На чацвёрты (сам распавядаў) надумаў кашы зварыць. Насыпаў у каструлю грэчкі, наліў вады, уключыў пліту і тэлевізар — у суседнім пакоі. Сеў там. Падумаў яшчэ, што жанчына — стварэнне само па сабе цікавае, але ж бесталковае, недасканалае. Вось, напрыклад, што яна цэлы вечар можа рабіць на кухні? Які сэнс таптацца там, стаяць ля пліты? Яна ж сама...

Пакуль разважаў так, з кухні пацягнула дымком. Грэчка знізу падгарэла, зверху была сырая і пахла, мякка кажучы, непрыемна. Выкінуў. Замачыў адну каструлю, узяў другую. Наліў вады, насыпаў круп, памяшаў, зноў пайшоў глядзець тэлевізар...

У выніку — не еўшы лёг, не спаўшы ўстаў, бо галодны і да поўначы мыў каструлі. Назаўтра жонку папрасіў:

— Слухай, ты напішы мне, як кашу варыць. Толькі падрабязна... Я не думаў, што будуць складанасці...

Гэта — з даўняга. З нядаўняга.

У тралейбусе па мабільным хлопец размаўляў. Пытаў некага:

— Колькі-колькі рысу ўзяць?

Праз паўзы:

— А вады?.. Каб яго закрывала?.. На колькі пальцаў?.. Тваіх ці маіх?.. А доўга варыць?.. Што-што зрабіць, каб ён не зляпіўся? Ага!..

Курс «маладога байца», трэба разумець, які да сваіх 17 тую кашу еў і ў думках не меў, як яна там зварана. Зараз — трэба самому...

Яшчэ, магчыма, і для таго, каб навучыцца... паважаць тую абсалютна «бессэнсоўную» жаночую тупаніну — паміж ракавінай, плітой і халадзільнікам.

## Ад каго Бог...

Вёсачка тая ў нізінцы ляжыць. Дваццаць хат у ёй некалі было, з кожнай па трое-чацвёра дзяцей у школу хадзіла — нацяняькі, цераз балота...

Зрэшты, не — балота ўжо не было, асушылі, хіба што назва засталася. І крынічкі не было — высахла: шнурок хмызняку віецца. Лесу таксама не стала — яго ў буру скрышыла... І людзей... Старыя памерлі, дзеці — параз'язджаліся...

Адно, што было, што ёсць і мо будзе, — камень: вялізазны, урослы ў зямлю... Форма ў яго цікавая: быццам нехта (агромністы) доўга сядзеў, як на беразе, на пяску, а потым устаў.

Бог, верылі продкі і вельмі ганарыліся.

Іх нашчадкі цяпер маўчаць, бо спачатку проста заўважылі, а потым пераканаліся: калі Бог і сядзеў на тым камені, то... гледзячы на лес — спінай да вёскі.

## Па праспекце

Чым зручны горад — тым, што блізка ўсё: крамы, прыпынкі, пошты, майстэрні, музеі, школы...

Раманаўне, напрыклад, да сваёй паліклінікі — рукою падаць: ехаць лёгка. Цяжэй потым ісці: з прыпынку трэба наперад і ўніз, у падземны пераход, потым наверх. Усяго — неяк злічыла — 76 прыступак. Моладзь па іх віхурай, а яна, з хворым сэрцам, на сваім дзявятым дзясятку...

Неяк, нядобра сябе адчуваючы, падумала: а, была не была — не палезу ў той пераход, праспект перайду па версе. На шчасце, там пуставата было — у тыя імгненні, а колькі крокаў ступіла — і спужалася: да яе імчалі машыны... Да таго ж даішнік як з-пад зямлі.

Уявіла, як зараз наблізіцца, як прычэпіцца, як давядзецца казаць яму пра хваробы...

Таго, што адбылося, не чакала ніяк: міліцыянер... спыніў транспарт, усміхнуўся ёй і нават руку да скроні прыклаў: гонар маю, маўляў, праходзьце.

Прайшла — пад прыязныя ўсмешкі кіроўцаў — адна, маленькая, па сваім жа праспекце Незалежнасці (пры ёй — Сталіна, Леніна ды Скарыны...). Аднак «эксперымент» свой паўтараць заракалася. Іншым таксама не раіла.

## Сцежкі, што мы выбіраем

Ля прыпынку дом узвялі, тэрыторыю вакол прыбралі, сцежкі праклалі — чытай «прадпісалі» жыхарам роўненька, метраў з пяць, прайсці ад пад'езда, потым павярнуць, прайсці паўз дом, яшчэ раз павярнуць...

Ёсць месцы, дзе людзі так, вядома ж, ходзяць, але ў большасці выпадкаў — не. Хіба ў гразь, калі абутку шкада. А так... Наўпрост, нацяняк, як дыктуе здаровы сэнс.

Зрэшты, справа мастакоў маляваць. Прымаць ці не прымаць «малюнак» — асабістая справа кожнага.

## На дым?

...Унук пасля дождж́ыка і якраз у чацвер знаёмага дзеда на вуліцу выцягнуў — папрасіў, каб вогнішча расклаў. Той, вядома ж, заўпарціўся: чыстую праўду казаў, што гарэць нічога не будзе, бо ўсё адсырэла.

— Не, не ўсё, — паправіў малы старога, — вунь колькі дроўцаў не зусім пад стрэшкай ляжыць.

Прыйшлося дзеду пайсці — абярэмак прынесці і потым пусціць — на пустое, як той казаў, на дым, на забаву ўнуку. Бо ён — першы і, відаць, апошні — пярэчанняў, лічы, не прымае, бо ён, ледзь што, адразу ж загадвае: «Дзед, упакойся!»

І той тады напраўду баіцца — «упакоіцца»... Без пары. Не застаўшыся ў дзіцячай памяці.

**Валянціна ДОЎНАР.**

# Праабражэнне з пахам яблыкаў

## Як сёння выглядаюць мясціны, дзе загінуў біблейскі цар Саул са сваімі сынамі, а будучы цар Давід перамог Галіяфа, і якія тайны захоўваюцца ў манастыры на гары Фавор


Праўдзівы Бог жадае нам найлепшага.

**Сёння праваслаўныя адзначаюць адно з вялікіх рэлігійных свят — Праабражэнне Госпада. Як сведчыць біблейская гісторыя, цуд адбыўся ў Галілеі на гары Фавор. Летась у кастрычніку падчас сваёй вандроўкі па Ізраілі я глядзела з той самай гары на навакольныя мясціны і спрабавала ўявіць сабе, як усё гэта адбылося. «Падчас малітвы на гары Фавор тры вучні Ісуса Хрыста — Пётр, Якаў і Іаан — убачылі, як Настаўнік змяніўся: праз шэсць дзён узяў Ісус Пятра, Якава і Іаана, брата Ягонага, і ўзвёў іх на гару высокую адных, і перамяніўся перад імі, і заззяла аблічча Ягонае, як сонца, а ўбранне Ягонае стала белае, як святло» (Мц 17:1-2).**


У Ізрэельскай даліне растуць і кукуруза, і кактусы.

### Узыходжанне на Галгофу

У Святой зямлі ўсюды, дзе праходзіў жыццёвы шлях Хрыста, стаяць храмы і манастыры. На гары Фавор знаходзіцца аж два манастыры — каталіцкі і праваслаўны. Старажытная гара нібы створана самой прыродай для асаблівых падзей: побач з ёю няма іншых падобных узвышшаў. Зверху адкрываецца цудоўны від на бліжэйшыя населеныя пункты Галілеі. Адсюль усяго некалькі кіламетраў да горада Назарэт, дзе прайшло маленства Хрыста. Менавіта адтуль яго маці і іншыя вучні бачылі тое самае незямное святло, якое сыходзіла ў дзень, калі Хрыстос паказаў гэты цуд траім сваім найбліжэйшым вучням — Іаану, Якаву і Пятру. Адсюль, з гэтай гары, і пачалося яго ахвярнае ўзыходжанне на Галгофу.

Старажытныя людзі праводзілі сваё жыццё ў дарозе. Кожны жыхар Ізраіля павінен быў пабываць у Іерусаліме як мінімум раз на год, а лепей тры. Мы ж амаль гадзіну едзем з Віфлеема да гэтага месца. Дарога вядзе ўздоўж мяжы з Іарданіяй... ўбок Іарданіі, з якой Ізраіль у напружаных адносінах. Мы ўвесь час рухаемся ўздоўж граніцы, і тэлефонная сувязь то знікае, то зноў з'яўляецца. За некалькі дзён знаходжання ў гэтай краіне мы ўжо прывыклі да таго, што большасць тутэйшых мясцін нагадвае выпаленыя сонцам пустэчы. Але сёння ўсё інакш. За вокнамі аўтобуса праплываюць зялёныя аазісы. «Збожжавыя нейкія? А можа, кукуруза?» — спрабуем разабрацца з суседкай. З іншага боку, якая кукуруза і збожжавыя могуць быць у апаленым сонцам Ізраілі? Аказваецца, могуць.

— Гэта не проста ўрадлівая даліна, тут Ісус вадзіў сваіх вучняў, расказваючы пра зярнятка гарчыцы, — кажа наша гід Аляксандра. — Тут ён у суботу збіраў каласкі і пераціраў іх. Тут і цяпер вырошчваюць збожжавыя. Таму, калі будзеце чытаць прытчы пра хлеб, зярняткі, згадвайце менавіта гэты паўночны раён. Ізрэельскую даліну яшчэ называюць далінай крыніц.

Праязджаем міма плантацыі з бавоўнай.

— У часы жыцця Хрыста тут і лён вырошчвалі, — кажа Аляксандра. — Памятаеце пахавальныя пакрывалы, у якія заварочвалі памерлых? І бавоўны шмат было, цяпер засталася толькі тэхнічная, а лёну наогул няма. Уся прамысловасць засяроджана на прыбярэжжы, а гэты раён лічыцца сельскагаспадарчым. Бавоўна расце тут не самая якасная, ёй далёка да ферганскай. Тутэйшая ідзе для патрэб арміі. А тыя ж кукуруза і сланечнік перапрацоўваюцца на камбікармы.

Зялёныя насаджэнні за вокнамі змяняюцца жылымі пабудовамі, па дарозе сустракаецца шмат мінарэтаў. Але гісторыю не схаваеш. Назвы населеных пунктаў кажуць самі за сябе. Напрыклад, горад Бейт-Шэан, які мы праязджаем, у Бібліі згадваецца як Скіфаполіс. Або вёска Наін, дзе Ісус уваскрэсіў удовінага сына. Ведаючы гэта, разумееш, што насельніцтва тут калісьці было іншай веры.

### Даліна войнаў

Ізрэельскую даліну называюць не толькі ўрадлівай, але яшчэ і далінай войнаў, за яе тут пастаянна ішлі баі. Горны хрыбет Гільбоа памятае жорсткі паядынак будучага цара Давіда з філістымлянінам Галіяфам. Давід, да таго як стаць царом, пасвіў авечак і іграў на ліры. Ён верыў у Праўдзівага Бога і што той не пакіне яго. Калі ён пачуў з боку варожага асілка кпіны ў бок войска Саула, дзе служылі ў тым ліку і ягоныя браты, не пабаяўся прыняць выклік і, прызваўшы ўсю моц Праўдзівага Бога, перамог волата.

А калі ў гэтай даліне загінуў цар Саул разам са сваімі сынамі, Давід аплакваў іх і сказаў, што загінулі найлепшыя. Усе навакольныя паселішчы былі названы імёнамі дзяцей цара Саула, напрыклад, кібуц Мерау. У гэтых мясцінах прапаведавала прарочыца Дэбора і натхняла на ратны подзвіг палкаводца Варака. Па яе парадзе ён вёў сваіх воінаў у бой. Дэбора ўмацавала яго, ішла наперадзе, біла ў барабан, і воіны перамаглі войскі Сісры. Пасёлак Дабурыя, які знаходзіцца каля падножжа гары Фавор, якраз і нагадвае пра тую самую прарочыцу Дэбору. «Людзі могуць памяняць дзяржаўную прыналежнасць, веру, але калі захоўваюцца назвы, разумееш, што было першапачаткова», — яшчэ раз нагадвае Аляксандра пра тое, што нічога схаваць або перапісаць немагчыма.


Каля цудадзейнай іконы.

### Гара святла

«Фавор» на іўрыце — святло, гара святла. Сама назва прывязвае да падзеі. Яе яшчэ называюць гарой Праабражэння. Яна была ўшанаваная ў тым ліку і тымі, хто пакланяўся грэчаскім багам. Калісьці наверсе быў храм часоў язычніцтва, прысвечаны Зеўсу. Гара Сінай адсюль далёка, але падчас свята Праабражэння пра яе таксама згадваецца. Тыя самыя дзесяць запаведзяў, якімі мы павінны кіравацца ў сваім жыцці, былі дадзены Маісею менавіта на гары Сінай. Кажуць, Маісей знешне быў не самым прыгожым чалавекам, на яго твары былі напісаны ўсе заганы, але калі ён спусціўся з гары Сінай, то быў ахоплены такім зззяннем, што людзі падалі на калені ў страху і глыбокай пашане. На Сінаі Майсей атрымаў запаведзі Божыя, а на Фаворы вучні Хрыста пачулі волю Айца Нябеснага. Ён засведчыў Ісуса як сына любага і загадаў: «Яго слухайце»...

З вокнаў аўтобуса добра відаць дзве пабудовы на вяршыні гары — адна двух'ярусная з серабрыстым дахам — гэта каталіцкі манастыр, — другая, крыху ніжэйшая, з чырвоным чарапічным дахам — манастыр Іерусалімскага праваслаўнага патрыярхату. Вялікі храмавы комплекс у імя Хрыста і сведак Праабражэння — апосталаў Пятра, Якава і Іаана — быў першапачаткова пабудаваны святой роўнаапостальнай царыцай Аленай, маці рымскага імператара Канстанціна І Вялікага. Ён знаходзіўся якраз вакол месца, дзе адбылося Праабражэнне Гасподне.

Яго, як і іншыя культавыя пабудовы часоў царыцы Алены і імператара Канстанціна, разбурылі мусульмане.

У XI стагоддзі крыжаносцы пабудавалі на гэтым месцы храм-крэпасць, але пасля іх сыходу зноў усё было разбурана. І толькі ў XIX стагоддзі вяршыню пачынаюць аднаўляць — каталікі намаганнямі ордэна францысканцаў, праваслаўныя — манаха Ірынарха, які знайшоў месца, дзе стаяў алтар візантыйскага храма і пачаў весці там службы. Мясцовасць была не вельмі бяспечная. Сюды часта заходзілі качавыя плямёны, рабавалі і забівалі людзей. Але падзвіжніцкі лад жыцця манаха выклікаў павагу ва ўсіх, у тым ліку і ў захопнікаў. Потым да Ірынарха далучыўся яшчэ адзін вернуючы, а калі ў патрыярхату з'явіліся сродкі, участак быў выкуплены. З гэтага моманту пачынаецца гісторыя будаўніцтва царквы і манастыра.

### Фавор у душы кожнага з нас

Вышыня гары — 588 метраў над узроўнем мора. Калісьці на яе вялі 4280 прыступак. Сёння можна падняцца па вінтавой дарозе пешшу, але большасць паломнікаў аддае перавагу міні-бусікам. Некалькі хвілін — і ты ўжо на гары. Аўтобусы ідуць туды адзін за адным. Мы таксама выбіраем гэты спосаб перамяшчэння. Але калі пад'язджаем да месца пасадкі, пачынаем хвалявацца. Народу шмат — пасрэць бы. Манастыр працуе некалькі гадзін у дзень, а потым закрываецца. Але нам шчасціць. Пакуль чакаем сваёй чаргі, аглядаем мясцовасць. Тут невялічкі музей пад адкрытым небам са старадаўнімі прадметамі быту, сувенірная крама, кавярня.

Аляксандра інструктуе, як паводзіць сябе ў манастыры, дзе ставіць свечкі, да якой іконы прыкласціся. У манастыры знаходзіцца і магіла заснавальніка Ірынарха. Ён, дарэчы, быў паслядоўнікам славутага старца Паісія Велічкоўскага. Унутры храма знаходзіцца ікона Неўвядальны цвет — тая самая, якую яшчэ называюць іконай з бутэлькі: у 1959 годзе каля берагоў Яфы рыбакі злавілі бутэльку з іконай, надрукаванай на паперы. У бутэльцы таксама была запіска, якая заклікала аддаць ікону свяшчэнніку на гару Фавор. Пажаданне было выкананае. У нас таксама была магчымасць прыкласціся да гэтага абраза. На ім шмат металічных пласцінак, якія сведчаць, што камусьці ікона дапамагла вылечыцца. Галоўнае — горача ў гэта верыць і маліцца. Фавор — тое самае месца, дзе чалавек умацоўваецца ў веры і атрымлівае жыццёвыя сілы.

**P.S.**

*Па народных прыкметах, на свята Праабражэння адбываецца і так званае пераўтварэнне прыроды. Гэта першы званочак, што набліжаецца восень. Сёлета прырода нас парадавала вельмі добрым ураджаем яблыкаў. Кажуць, што самы каштоўны смак яны набываюць менавіта сёння, падчас вялікага свята. У гэты дзень плады асвячаюцца ў царкве. Некаторыя лічаць, што да Праабражэння яблыкі новага ўраджаю есці нельга. У гэтым, напэўна, нешта ёсць — асабліва калі згадаць старазапаветную гісторыю пра Адама і Еву.*

**Нэлі ЗІГУЛЯ,**
**фота аўтара.**


На тэрыторыі манастыра.





# У АБ'ЕКТЫВЕ — ЗІМАРОДАК

Яшчэ ніколі не даводзілася мне так доўга і апантана здымаць дзікіх птушак, як я рабіў гэта, назіраючы і вывучаючы маленькага і імклівага крылатага жыхара нашых рэк, азёраў і ручаёў — зімародка. Калісьці здалёк бачыў гэтую вельмі скрытную і надзіва прыгожую птушачку, а вось так блізка, можна сказаць, з адлегласці выцягнутай рукі, упершыню. Любаваўся ёю і ўволю здымаў. Больш за тры тыдні свайго сёлетняга чарговага адпачынку я правёў побач з зімародкавай сям'ёю. І гэта было сапраўдным паляўнічым шчасцем. Пачаліся птушыныя прыгоды на адным з меліярацыйных каналаў у Смалявіцкім раёне, калі прырода толькі-толькі перайшла на летнюю вопратку. Менавіта тады і там я пачуў знаёмы і вельмі пранізлівы свіст — «цііт-ційі». Сапраўды, нізка над вадой праляцела блакітна-серабрыстая маланка, як называюць арнітолагі зімародка. І гэта быў сігнал, які перакрэсліў усе мае наступныя планы. Узброіўшыся даўгафокусным фотааб'ектывам, палаткай і тыднёвым правіянтам, я пакінуў сталіцу і стаў суседам рэдкай птушкі-рыбачкі, якая занесена ў Чырвоную кнігу Беларусі. Прыйшлося пабудаваць часовую невялікую схованку каля нары, дзе выводзіліся птушаняты, пільнаваць, як птушкі садзіліся на галінкі вербалозу і на старыя камлі і... пазіравалі, як дарослыя птушкі прыносілі і кармілі сваіх гадаванцаў маленькай рыбай. Дачакаўшыся, калі апошняе птушаня пакінула гняздо, я зрабіў фота, на якім дарослы зімародак частуе малога «рыбным ласункам» — за яго першы і смелы палёт.

Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.









ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

## РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ» 15 октября 2020 года проводит 17-й открытый аукцион по продаже имущества республиканской собственности

| Номер лота | Наименование техники | Местонахождение объекта | Начальная цена продажи (бел. руб.) | Сумма задатка (бел. руб.) |
|---|---|---|---|---|
| 179 | Специальный автомобиль «Урал-375» с кузовом-фургоном К2-375 в составе: кузов-фургон К2-375 № 05029, 1979 г., *4 кат.*, автошасси «Урал-375», ш. 298330, дв. 899255, 1979 г., *4 кат.*, *1389 км* | г. Гомель, в/ч 01313-Г | 7 500,00 | 1500,00 |
| 180 | Грузовой бортовой ГАЗ-66-11, ш. 0608335, дв. 278038-89, 1990 г., *4 кат.*, *5841 км* | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 3 400,00 | 680,00 |
| 181 | Специальный автомобиль ГАЗ-66 с кузовом-фургоном КФ-1МП в составе: кузов-фургон КФ-1МП № 39008123, 1983 г., *2 кат.*, автошасси ГАЗ-66, ш. 0353813, дв. 241673, 1983 г., *3 кат.*, *832 км* | г. Осиповичи, в/ч 01313 | 4 100.00 | 820,00 |
| 182 | Специальный автомобиль ГАЗ-66-05 с кузовом-фургоном КФ-1МП в составе: кузов-фургон КФ-1МП № 36038883, 1983 г., *2 кат.*, автошасси ГАЗ-66-05, ш. 0340968, дв. 162391, 1983 г., *3 кат.*, *1232 км* | г. Осиповичи, в/ч 01313 | 4 000,00 | 800,00 |
| 183 | Специальный автомобиль ГАЗ-66-15 с кузовом-фургоном КФ-1МП в составе: кузов-фургон КФ-1МП № 80026888, 1988 г., *2 кат.* автошасси ГАЗ-66-15, ш. 0549003, дв. 164284, 1988 г., *3 кат.*, *27 км* | г. Осиповичи, в/ч 01313 | 4 200,00 | 840,00 |
| 184 | Специальный автомобиль ГАЗ-66-15 с кузовом-фургоном КФ-1МП в составе: кузов-фургон КФ-1МП № 56094186, 1986 г., *2 кат.*, автошасси ГАЗ-66-15, ш. 0439610, дв. 7251, 1986 г., *3 кат.*, *1614 км* | г. Осиповичи, в/ч 01313 | 4 200,00 | 840,00 |
| 185 | Специальный автомобиль ГАЗ-66-15 с кузовом-фургоном КФ-1МП в составе: кузов-фургон КФ-1МП № 63094106, 1986 г., *2 кат.*, автошасси ГАЗ-66-15, ш. 0475358, дв. 227134, 1986 г., *3 кат.*, *1321 км* | г. Осиповичи, в/ч 01313 | 4 200,00 | 840,00 |
| 186 | Седельный тягач КамАЗ-5410, ш. 128599, дв. 741790, 1985 г., *4 кат.*, *30 251 км* | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 8 000,00 | 1 600,00 |
| 187 | Грузовой бортовой «Урал-432020-01», ш. 171749, дв. 767418, 1991 г., *4 кат.*, *74 513 км* | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 8 000,00 | 1 600,00 |
| 188 | Грузовой бортовой КамАЗ-43105, ш. 003151, дв. 735520, 1985 г., *4 кат.*, *31 743 км* | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 8 600,00 | 1 720,00 |
| 189 | Грузовой бортовой КамАЗ-43106, ш. 0000048, дв. 0430146 1989 г. *4 кат. 98 996 км* | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 8 500,00 | 1 700,00 |
| 190 | Грузовой бортовой КамАЗ-43106, ш. 000544, дв. 441548, 1989 г., *4 кат.*, *106 437 км* | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 8 200,00 | 1 640,00 |
| 191 | Грузовой бортовой КамАЗ-43106, ш. 0005416, дв. **4498, 1990 г., *4 кат.*, *102 240 км* | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 8 500,00 | 1 700,00 |
| 192 | Автошасси «Урал-43202-0011-01», ш. 154115, дв. 788373, 1990 г., *4 кат.*, *33 159 км* | г. Береза, в/ч 23324 | 8 000,00 | 1 600,00 |

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Казинца, д. 2, 6-й этаж, **15 октября 2020 г. в 10.00.**

К участию в аукционе допускаются юридические лица, индивидуальные предприниматели и физические лица, оплатившие задаток, гарантийный депозит и подавшие заявление на участие в аукционе, соглашение, учредительные и другие необходимые документы до **15.00 12 октября 2020 года**.

Заключительная регистрация участников аукциона будет производиться **15 октября 2020 г. с 9.00 до 9.45.**

**Победитель аукциона обязан:**

1. Заключить договор купли-продажи не позднее 3 банковских дней с момента проведения аукциона.

2. Произвести оплату стоимости движимого имущества разовым платежом в течение **5** банковских дней для резидентов Республики Беларусь и **10** банковских дней для нерезидентов Республики Беларусь со дня подписания договора купли-продажи.

Задаток, указанный в таблице, а также гарантийный депозит в размере 300,00 белорусских рублей за участие по каждому лоту и денежные средства за выигранное имущество перечисляются на расчетный счет РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ»:
белорусские рубли – р/с BY12BELB30120002R20010226000, российские рубли – р/с BY64BELB30120002R20040226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», ул. Заславская, 10, код BELBBY2X, УНП 101099370, ОКПО 37401662. Корреспондент – ПАО Сбербанк, г. Москва № корсчета 30101810400000000225. Реквизиты банка: БИК 044525225, ИНН 7707083893, к/с в ОАО «Банк БелВЭБ» № 30111810800000000659. SWIFT/BIC: SABRRUMM. Без НДС.

**Справки по тел./факсу (017) 398 05 41.**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ № 2020.Б.002.000016

**Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга» извещает о проведении электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего Открытому акционерному обществу «Минский завод строительных материалов», УНП 100008102, в отношении которого открыто производство по делу об экономической несостоятельности (банкротстве) № 455-5Б/2018 в экономическом суде г. Минска**

Номер лота, вид выставляемого на электронные торги имущества:

| № лота | Наименование | Начальная цена без НДС, руб. | Минимальная цена |
|---|---|---|---|
| 1 | Мельница высокопроизводительная SMMC ALFA, инв. № 501348 (лот № 6/07-2020) | 51 500,00 | 36 050,00 |
| 2 | Виброгрохот двухэтажный ALFA, инв. № 501347 (лот № 6/07-2020) | 42 100,00 | 29 470,00 |
| 3 | Барабан первичного измельчения RZ01, инв. № 501817 (лот № 8/07-2020) | 34 100,00 | 23 870,00 |
| 4 | Металлоискатель, инв. № 501350 (лот № 9/07-2020) | 38 700,00 | 27090,00 |
| 5 | Питатель в-2000 с бункером, инв. № 501317 (лот № 10/07-2020) | 49 300,00 | 34 510,00 |
| 6 | Питатель ленточный ЯСМК-488, инв. № 501354 (лот № 11/07-2020) | 36 400,00 | 25 480,00 |
| 7 | Транспортер, инв. № 501343 (лот № 12/07-2020) | 16 900,00 | 11 830,00 |
| 8 | Просеивающее устройство ALFA, инв. № 501344 (лот № 13/07-2020) | 5 100,00 | 3 570,00 |
| 9 | Манипулятор гидравлический М-75, инв. № 501358 (лот № 14/07-2020) | 17 800,00 | 12 460,00 |
| 10 | Питатель В-800, инв. № 501399 (лот № 15/07-2020) | 27 300,00 | 19 110,00 |
| 11 | Распределительный шнек, инв. № 501349 (лот № 16/07-2020) | 6 700,00 | 4 690,00 |
| 12 | Транспортер пластинчатый, инв. № 501357 (лот № 17/07-2020) | 2 300,00 | 1 610,00 |
| 13 | Транспортер подачи поризатора L= 26 м, инв. № 501294 (лот № 18/07-2020) | 18 700,00 | 13 090,00 |
| 14 | Конвейер ленточный В – 500, инв. № 501509 (лот № 19/07-2020) | 1 900,00 | 1 330,00 |
| 15 | Возвратный шнек, инв. № 501345 (лот № 20/07-2020) | 6 400,00 | 4 480,00 |
| 16 | Транспортер подачи поризатора L= 16 м, инв. № 501316 (лот № 21/07-2020) | 6 300,00 | 4 410,00 |
| 17 | Транспортер подачи поризатора L 8 м, инв. № 501295 (лот № 22/07-2020) | 2 500,00 | 1 750,00 |
| 18 | Конвейер В-800, инв. № 501298 (лот № 23/07-2020) | 3 900,00 | 2 730,00 |
| 19 | Транспортер подачи поризатора L 6 м, инв. № 501296 (лот № 24/07-2020) | 2 000,00 | 1 400,00 |
| 20 | Аспирационная установка FT-504, инв. № 501352 (лот № 25/07-2020) | 2 000,00 | 1 400,00 |
| 21 | Аспирационная установка FT-504, инв. № 501353 (лот № 26/07-2020) | 2 000,00 | 1 400,00 |
| 22 | Аспирационная установка FT-502, инв. № 501351 (лот № 27/07-2020) | 1 700,00 | 1 190,00 |
| 23 | Пресс испытательный ИП-2500М, инв. № 501359 (лот № 28/07-2020) | 35 600,00 | 24 920,00 |
| 24 | Станок токарно-винторезный GH20120 ZH, инв. № 501480 (лот № 29/07-2020) | 21 119,18 | 14 783,43 |
| 25 | Станок консольно-фрезерный универсальный, инв. № 500898 (лот № 30/07-2020) | 24 824,30 | 17 377,01 |
| 26 | Прессовая группа (пресс шнековый MAGNA 675), инв. № 501700 (лот № 31/07-2020) | 628 017,84 | 439 612,49 |
| 27 | Экструдер VAP65, инв. № 501108 (лот № 32/07-2020) | 615 049,92 | 430 534,94 |
| 28 | Резательное устройство тип A-UV, инв. № 501105 (лот № 33/07-2020) | 89 663,90 | 62 764,73 |
| 29 | Робот садки с захватом, инв. № 501706 (лот № 34/07-2020) | 231 570,00 | 162 099,00 |
| 30 | Робот садки с захватом, инв. № 501707 (лот № 35/07-2020) | 231 570,00 | 162 099,00 |
| 31 | Сушильный барабан, инв. № 501257 (лот № 36/07-2020) | 105 040,15 | 73 528,11 |
| 32 | Древорубка ALFA, инв. № 501346 (лот № 37/07-2020) | 47 240,28 | 33 068,20 |
| 33 | Вакуумный насос для прессовой группы С S6/18.5VFA, инв. № 501675 (лот № 38/07-2020) | 25 565,33 | 17 895,73 |

Оборудование бывшее в употреблении.

Размер шага составляет 5 процентов от начальной цены лота.

Имеющиеся обременения: нет.

**Дата и время начала и завершения электронных торгов: 21.09.2020 с 9.00 до 16.00.**

Электронные торги проводятся на электронной торговой площадке Коммунального консалтингового унитарного предприятия «Витебский областной центр маркетинга» по электронному адресу http://etpvit.by/.

Для участия в электронных торгах на электронной торговой площадке по электронному адресу http://etpvit.by/ необходимо подать заявку на участие в электронных торгах и пройти аккредитацию в качестве участника электронных торгов, а также перечислить задаток в срок до 16.00 18.09.2020.

